ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 78 (1612) | Аўторак, 3 кастрычніка 1961 года | Цана 4 кап.

СЁННЯ Ў ГАЗЕЦЕ

◆ ДА ВЫНІКАЎ АБМЕРКАВАННЯ ПРАБЛЕМ РАЗВІЦЦЯ ТЭАТРАЛЬНАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ. ◆ ГАЛОЎНАЕ Ў ДЗІЦЯЧЫХ МУЗЫЧНЫХ ТВОРАХ — СУЧАСНАСЦЬ, ПРЫГАЖОСЦЬ, ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ МУЗЫЧНАЙ МОВЫ. ◆ РЫСЫ НАШАГА ЖЫЦЦЯ: САВЕЦКІ ЧАЛАВЕК ГАТОЎ Ў ЛЮБУЮ ХВІЛІНУ ДАПАМАГЧЫ ТАВАРЫШУ. ◆ «АНТАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ» — САПРАЎДНЫ ВЯНОК ФАРБАЎ І ГУКАЎ РОДНАГА КРАЮ. ◆ ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНАЯ КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ ПАВІННЫ БЫЦЬ Ў АБЛАСНЫМ ДРУКУ. РЭЦЭНЗІІ НА КНІГІ ◆ МАЛАВЯДОМЫ ТВОР ЖЫВАПІСЦА В. ВЕРАШЧАГІНА. ◆ НОВАЯ ВЕРСІЯ ПРА АЎТАРСТВА ПАЭМЫ «ТАРАС НА ПАРНАСЕ».

ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ, ВЫСОКІ АБАВЯЗАК

XXV з'езд Камуністычнай партыі Беларусі, які адбыўся гэтымі днямі, з'явіўся буйнай падзеяй у жыцці нашай рэспублікі. З'езд абмеркаваў і аднадушна адобрыў праекты Праграмы і Статута КПСС — дакументы гістарычнай важнасці. У рэзалюцыі з'езда аб праекце Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза гаворыцца: «Савецкі народ бачыць у праекце Праграмы КПСС выражэнне сваіх карэнных, жыццёвых інтарэсаў, запаветных спадзяванняў і надзей».

З'езд заслухаў і абмеркаваў справаздачны даклад аб рабоце Цэнтральнага Камітэта КПБ. У дакладзе і ў выступленнях дэлегатаў з'езда знайшлі тлыбокае адлюстраванне працоўныя поспехі беларускага народа. Тэмпы росту прамысловай вытворчасці ў рэспубліцы значна перавышаюць намёткі кантрольных лічбаў сямігадовага плана. За два з палавінай года сямігодкі ўступіла ў строй 38 буйных прамысловых прадпрыемстваў і ажыццёўлена рэканструкцыя 246 прадпрыемстваў рэспублікі. Дзесяткі заводаў і фабрык працуюць сёння ўжо на ўзроўні, прадугледжаным на 1964 і 1965 гады. У вялікім руху калектываў і ўдарнікаў камуністычнай працы ўдзельнічаюць больш чым 300 тысяч рабочых, 12,5 тысячы змен, участкаў, цэхаў, брыгад. Працаўнікі вёскі настойліва змагаюцца за павелічэнне вытворчасці збожжа, павышэнне ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур, за павелічэнне пагалоўя жывёлы і вытворчасці мяса, малака, масла, яек.

Адзначаючы поспехі ў развіцці народнай гаспадаркі, з'езд, разам з тым, галоўную ўвагу ўдзяліў дзелавому абмеркаванню гаспадарчых і палітычных задач, якія стаяць перад рэспублікай і яе Камуністычнай партыяй, крытыцы недахопаў, што перашкаджаюць у рабоце, ускрыццю рэзерваў і нявыкарыстаных магчымасцей у дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў.

З'езд прадэманстраваў непахісную волю камуністаў і ўсіх працоўных рэспублікі самаадданa змагацца за ажыццяўленне задач, якія з гранічнай выразнасцю і навуковай абгрунтаванасцю вызначаны ў праекце Праграмы КПСС.

У святле гэтага велічнага дакумента яшчэ больш узрастае роля савецкай літаратуры і мастацтва ў жыцці нашага грамадства, узрастае ўвага да пытанняў культурнага будаўніцтва. Бо каб стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу камунізма, патрэбна высокая свядомасць мас. Бо ад культурнага росту насельніцтва ў велізарнай ступені залежыць і прагрэс тэхнікі, і ўздым прадукцыйных сіл, і павышэнне грамадскай актыўнасці працоўных, і камуністычная перабудова быту. А выхоўваць высокую свядомасць, несці ў шырокія народныя масы культуру якраз і закліканы савецкая літаратура, савецкае мастацтва, нашы культурна-асветныя ўстановы.

Як адзначалася ў справаздачным дакладзе таварыша К. Т. Мазурава на XXV з'ездзе КПБ, работнікі літаратуры і мастацтва рэспублікі дабіліся пэўных творчых поспехаў. Пісьменнікі стварылі рад новых твораў, якія адлюстроўваюць героіку нашых дзён, неўміручы подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Паспяхова развіваецца тэатральнае мастацтва, усё больш актыўна адлюстроўваючы на сцэне жыццё нашага сучасніка. Многа новых музычных твораў напісалі кампазітары рэспублікі. Ёсць дасягненні і ў беларускіх мастакоў. Рыхтуючыся да ўсесаюзнай выстаўкі, якая адкрываецца ў Маскве ў гонар XXII з'езда КПСС, многія мастакі напісалі яркія палотны.

І ўсё ж народ чакае ад сваіх песняроў большага. Мала ў нас яшчэ нараджаецца высокамастацкіх, яркіх твораў пра сучаснасць. Працоўны гераізм народа-будаўніка, камунізма яшчэ не знаходзіць дастатковага мастацкага адлюстравання. І ў літаратуры, і ў жывапісе, і ў скульптуры, і ў музыцы нярэдка з'яўляюцца творы, адзначаныя нізкім прафесіянальным узроўнем. Павышэнне майстэрства — адна з важных і надзённых праблем нашай літаратуры і мастацтва.

Аналізуючы перад дэлегатамі з'езда КПБ сучасны стан беларускай літаратуры і мастацтва, таварыш К. Т. Мазураў адзначыў цэлы рад недахопаў у дзейнасці нашых творчых арганізацый. Рэпертуар некаторых тэатраў фарміруецца яшчэ недастаткова прадумана. Гледачам паказваюцца спектаклі, якія не вызначаюцца багаццем ідэйнага зместу, мала цікавыя па сродках мастацкага выяўлення. Слабыя ў ідэйных і мастацкіх адносінах творы трапляюць і ў канцэртныя праграмы эстрадных і музычных калектываў. Гэтыя калектывы і асобныя выканаўцы недастаткова працуюць над абнаўленнем свайго рэпертуару, асабліва за лік лепшых твораў, якія маюць бадзёрую патрыятычную накіраванасць. Буйныя недахопы ў рабоце дапускае студыя «Беларусьфільм». Студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў працуе таксама нездавальняюча, павярхоўна і аднастайна паказвае жыццё рэспублікі.

Справядлівая і прынцыповая крытыка, якой былі падвергнуты на з'ездзе творчыя арганізацыі рэспублікі, дабратворна паспрыяе ліквідацыі недахопаў у іх рабоце, мабілізацыі сіл пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, дзеячоў сцэны, усіх работнікаў мастацтва на стварэнне новых яркіх твораў пра сённяшні дзень краіны.

Кіпучае стваральнае жыццё народа — вось невычэрпная крыніца тэм, вобразаў, натхнення для кожнага сапраўднага мастака.

Умацаванне сувязей з жыццём народа, праўдзівае і высокамастацкае адлюстраванне багацця і мнагастайнасці сацыялістычнай рэчаіснасці, натхнёны і яркі паказ новага, сапраўды камуністычнага, і выкрыццё ўсяго таго, што перашкаджае духу грамадства наперад, — вось галоўная лінія ў развіцці літаратуры і мастацтва, акрэсленая ў праекце Праграмы КПСС. Прасякнутыя аптымізмам і жыццесцвярджальнымі камуністычнымі ідэямі, савецкая літаратура і мастацтва закліканы служыць крыніцай радасці і натхнення для мільёнаў людзей, выражаць іх волю, пачуцці і думкі, служыць сродкам іх ідэйнага ўзбагачэння і маральнага выхавання.

Цяпер, калі савецкі народ прыступіў да стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма, калі светлая камуністычная будучыня ўжо блізкая, дзеячы літаратуры і мастацтва, усе работнікі савецкай культуры павінны з асаблівай вастрынёй і адказнасцю дбаць пра свой вялікі і пачэсны ўклад у набліжэнне гэтай будучыні. Камуністычная партыя нястомна клапоціцца аб росквіце савецкай культуры, аб стварэнні ўсіх умоў для найбольш поўнага праяўлення асабістых здольнасцей кожнага чалавека, аб эстэтычным выхаванні працоўных, фарміраванні ў народзе высокіх мастацкіх густаў і культурных навыкаў.

У гэтай справе вялікае месца належыць і культурна-асветным установам.

У нашай рэспубліцы створана густая сетка гэтых устаноў: працуе 5 330 клубаў і сельскіх дамоў культуры, звыш 20 тысяч бібліятэк, 4 014 кінаўстановак. З кожным годам становіцца ўсё больш універсітэтаў культуры, народных тэатраў, універсітэтаў эстэтычнага выхавання і г. д. Усё гэта — вялікая сіла. Аднак не ўсюды яна выкарыстоўваецца як след. Многія клубныя ўстановы працуюць без ініцыятывы, у адрыве ад жыцця. Будаўніцтва і добраўпарадкаванне ўстаноў культуры, асабліва калгасных клубаў, у многіх вёсках і раёнах вядзецца дрэнна. У рэпертуары самадзейных калектываў шмат такога, што ніяк не садзейнічае ідэйнаму і культурнаму росту людзей. Залішне паблажліва ставяцца работнікі кінапракату да замежных фільмаў, дэманстрацыя якіх у кінатэатрах спрыяе працягванню ў наша асяроддзе буржуазнай ідэалогіі.

Як адзначалася на XXV з'ездзе КПБ, недахопы культурна-асветнай работы тлумачацца тым, што Міністэрства культуры БССР, Белсаўпроф, партыйныя і савецкія органы, камсамол не ўдзяляюць належнай увагі рабоце культасветустаноў, слаба цікавяцца зместам клубнай работы, дрэнна арганізоўваюць падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў культасветработнікаў, асабліва кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. З'езд падкрэсліў неабходнасць павысіць ролю ўстаноў культуры ў камуністычным выхаванні працоўных і ўзняць ідэйны ўзровень іх работы, дабівацца, каб на кожным прадпрыемстве, у кожным калгасе і саўгасе былі створаны неабходныя ўмовы для культурнага адпачынку працоўных.

Праект Праграмы КПСС прадугледжвае далейшы магутны ўздым матэрыяльнай базы культуры: усямернае развіццё кнігавыдавецкай справы і друку; павелічэнне сеткі бібліятэк, лекцыйных і чытальных залаў, тэатраў, клубаў, дамоў культуры, кінатэатраў; завяршэнне радыёфікацыі краіны, будаўніцтва тэлевізійных цэнтраў, якія ахопліваюць усе прамысловыя і сельскагаспадарчыя раёны; шырокае развіццё народных універсітэтаў і іншых самадзейных культурных арганізацый; стварэнне шырокай сеткі агульнадаступных навуковых і тэхнічных лабараторый, мастацкіх майстэрань і кінастудый для работы ўсіх, хто мае імкненне і здольнасці. Культурнае развіццё ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства з'явіцца завяршаючым этапам вялікай культурнай рэвалюцыі.

Культура камунізма ўбірае ў сябе і развівае ўсё лепшае, што было створана сусветнай культурай, увасобіць у сабе ўсю мнагастайнасць і багацце духоўнага жыцця грамадства, высокую ідэйнасць і гуманізм новага свету.

Ствараць культуру камунізма — якое гэта вялікае шчасце!

Дзеячы літаратуры і мастацтва Беларусі, усе работнікі культуры ясна ўсведамляюць свой высокі абавязак, свае вялікія задачы. Верныя сцягу камунізма, яны яшчэ з большай стараннасцю будуць працаваць над новымі творамі, унясуць свой дастойны ўклад у выкананне рашэнняў XXV з'езда КПБ, у дастойную сустрэчу XXII з'езда КПСС.

ГЭТА—КІТАЙ

2 кастрычніка ў Беларускім таварыстве дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі адкрылася выстаўка мастацкай фатаграфіі Кітайскай Народнай Рэспублікі. Выстаўку адкрыў старшыня беларускага аддзялення Таварыства кітайска-савецкай дружбы тав. Макараў. Ён гаварыў пра непарушную дружбу савецкага і кітайскага народаў, якія поплеч ідуць да вялікай мэты, пра гіганцкія пераўтварэнні, здзейсненыя кітайскім народам пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі Кітая.

112 фатаграфій выстаўкі гавораць пра гэта. Заводы, шахты, трактары на палях, гурткі па ліквідацыі непісьменнасці, гіганцкія плаціны на раках... Неабсяжныя палі і дзікія горы, старадаўнія храмы і вуліцы сучасных гарадоў, уборка рысу і выплаўка сталі... Гэта—Кітай. Гэта—рысы краіны, дзе скінута ярмо каланіяльнага рабства і будуецца новае жыццё.

А якія здзіўляючыя па майстэрству каляровыя здымкі!

ВЕЧАР ДРУЖБЫ

Днямі ў памяшканні Тэатра імя Я. Купалы адбыўся вечар сучаснай польскай паэзіі, арганізаваны Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі і Саюзам пісьменнікаў БССР. Вечар адкрыў паэт Максім Танк. З дакладам аб сучаснай польскай паэзіі выступіў Пятро Глебка. Цёпла сустрэлі прысутныя выступленне сакратара Таварыства польска-савецкай дружбы Тадэуша Ксенжака. М. Лужанін, Я. Семяжон, П. Пестрак, А. Астрэйка і М. Аўрамчык прачыталі свае пераклады вершаў сучасных польскіх паэтаў. У заключэнне вечара быў паказан спектакль «Лявоніха на арбіце».

Харастве душы

Прыгожы, адухоўлены твар... Пяшчотныя, ласкавыя дзявочыя рукі ўпэўнена, па-майстэрску кіруюць машынай...

Гэта — Алена Лазарэнка, ткачыха Мінскага тонкасуконнага камбіната, дэлегатка XXII з'езда КПСС.

Калі мы пацікавіліся ў парткоме, чым яна заслужыла такую вялікую павагу сваіх таварышаў, нам, не задумваючыся, адказалі: выключнай працавітасцю, сціпласцю, майстэрствам.

Алена першая на камбінаце пачала працаваць на трох станках. Ударніца камуністычнай працы, дэпутат Мінскага гарсавета, член партыйнага бюро камбіната, — яна ўжо цяпер дасягнула прадукцыйнасці працы, якая запланавана на апошні год сямігодкі.

Гэта цяпер, а раней? Мы пытаемся ў Алены пра яе першыя працоўныя крокі.

— Сёлета,— гаворыць яна,— споўніцца дзесяць год з таго дня, калі я шаснаццацігадовай дзяўчынай упершыню прыйшла на камбінат. Аб вытворчасці не мела ніякага ўяўлення. Мяне аглушаў гул станкоў, я адчувала сябе маленькай, разгубленай. А калі паглядзела на работу тканчыхі Ніны Карпікавай, падумала — ніколі не навучуся так працаваць. Па начах нават плакала.

— А потым?

— Потым працавала вучаніцай. З дапамогай Ніны Карпікавай і ўсяго калектыву паступова авалодвала складанай прафесіяй. З'явілася ўпэўненасць. Праз два-тры месяцы пачала працаваць самастойна. Я адразу адчула, што на адной упэўненасці, без ведаў, далёка не пойдзеш. Паступіла ў вячэрнюю школу, тут жа, пры камбінаце. Гэтае прадпрыемства стала маім родным домам, сапраўднай школай працы і жыцця. Тут я ўступіла ў камсамол, тут мяне прынялі ў кандыдаты, а потым у члены маёй роднай партыі.

Брыгада, у якой працавала Лазарэнка, з цягам часу заваявала званне калектыву камуністычнай працы. Па прыкладу Валянціны Гаганавай Лазарэнка перайшла ў адстаючую брыгаду.

— Мы многа думалі над тым, як павялічыць прадукцыйнасць працы, шукалі рэзервы. І знайшлі рашэнне. Па прапанове нашага брыгадзіра Віктара Кажурына вырашылі аб'яднаць чатыры калектывы адной комплекснай брыгадай. Цяпер мы ўсе разам працуем значна лепш.

Мы гутарым у маленькім пакойчыку начальніка цэха. Праз тонкія фанерныя сценні выразна чуваць гул ткацкіх станкоў. Адзін з рабочых пакінуў дзверы адчыненымі. Калі мы памкнуліся зачыніць іх, маўляў, вельмі шумна, Алена сказала:

— Ну, што вы, які гэта шум. Гэта ж— песня.

Яе твар асвятліла ўсмешка.

— Мая любімая мелодыя. Мне заўсёды здаецца, што нечага не хапае, калі не чую яе.

— Якія мае думкі аб праекце Праграмы партыі? Самыя ўзнёслыя, самыя радасныя. Калі мы з сяброўкамі абмяркоўваем гэты велічны дакумент, у нас ствараецца ўражанне, быццам мы абмяркоўваем сваё ўласнае жыццё. І гэта сапраўды так. Я добра памятаю словы Праграмы: «Перамога камунізма залежыць ад людзей, і камунізм будуецца для людзей. Кожны савецкі чалавек сваёй працай набліжае перамогу камунізма». Сваёй працай!

— Скажыце, Алена, а які вы асабіста рыхтуеце працоўны падарунак XXII з'езду партыі?

— Маё абавязацельства — штодзённа выконваць зменнае заданне на 105 працэнтаў, эканоміць 10 кілаграмаў пражы і даць звыш плана 400 метраў гатовага сураўя.

Мінская абласная партыйная канферэнцыя выбрала Алену Лазарэнка дэлегатам на XXII з'езд КПСС.

Як яна гэта ўспрыняла, што адчула? Гэта, бадай, самае хвалюючае для яе пытанне.

Дзяўчына доўга маўчыць. Погляд яе карых, крыху расносых вачэй накіроўваецца некуды ўдалячынь.

— Мне вельмі цяжка знайсці адпаведныя словы, — усхвалявана гаворыць яна,—каб выказаць сваё шчасце, гонар, радасць. Найвялікшае давер'е, якое мне аказалі партыя, таварышы, я імкнуся апраўдаць кожным днём сваёй працы.

Лепшых, дастойных прадстаўнікоў пасылаюць камуністы на свой XXII з'езд. І сярод іх Алена Лазарэнка — наша сучасніца, чалавек прыгожай душы. Натхнёная праца такіх людзей — надзейная зарука нашай светлай будучыні.

ВЫСТАЎКА «СЯМІГОДКА Ў ДЗЕЯННІ»

У Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстаўка «Сямігодка ў дзеянні», прысвечаная XXII з'езду КПСС. У раздзеле «Прамысловасць» дэманструюцца ўзоры вырабаў, вытворчасць якіх асвоена за гады сямігодкі на шматлікіх прадпрыемствах Магілёўшчыны. Тут розныя машыны і механізмы, будаўнічыя матэрыялы, рэчы шырокага ўжытку. Прыцягвае ўвагу прыгожы гарнітур для кватэр з двух пакояў. Уся мэбля сучасная, малагабарытная, вельмі зручная. Гэты гарнітур распрацаваны на Бабруйскай мэблевай фабрыцы імя Халтурына і асвоены калектывам прадпрыемства датэрмінова, да XXII з'езда КПСС. Асобныя стэнды прысвечаны барацьбе за тэхнічны прагрэс, руху за камуністычную працу, які набыў у вобласці шырокі размах, творчай дзейнасці рацыяналізатараў і вынаходнікаў.

Многа экспанатаў багатых дароў восені выстаўлена на стэндах, дзе дэманструюцца поспехі працаўнікоў сельскай гаспадаркі.

Цікавы аддзел «Горад Магілёў у сямігодцы». На выстаўцы дэманструюцца макеты новых вуліц, жылых ансамбляў, новага мікраёна, забудова якога ўжо разгарнулася.

Асобныя стэнды прысвечаны дасягненням у галіне народнай адукацыі, аховы здароўя, культуры.

У СЕКЦЫІ КРЫТЫКІ СП БССР

Секцыя крытыкі СП БССР наладзіла абмеркаванне літаратурна-крытычных матэрыялаў у рэспубліканскіх маладзёжных газетах, у абласным друку і ў часопісе «Беларусь». З дакладамі выступілі Д. Бугаеў, В. Каваленка, М. Стральцоў, Р. Шкраба.

У абмеркаванні пытанняў крытыкі і бібліяграфіі ў перыядычным друку прынялі ўдзел загадчыкі аддзелаў культуры абласных газет тт. Галагуцкі (Гродна), Ісачанка (Магілёў), Паўлоўскі (Брэст) і інш.

Юбілей Віталія Вольскага

30 верасня ў клубе Саюза пісьменнікаў БССР адбыўся вечар, прысвечаны творчасці беларускага драматурга, празаіка і літаратуразнаўцы Віталія Вольскага ў сувязі з 60-годдзем з дня яго нараджэння.

Уступнае слова на вечары сказаў старшыня праўлення СП Беларусі Пятрусь Броўка.

З дакладам пра жыццё і творчасць Віталія Вольскага выступіў Алесь Кучар.

Юбіляра горача віталі прадстаўнікі грамадскасці рэспублікі, журналісты, пісьменнікі.

Адбыўся канцэрт Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы.

Самадзейнасць? Так. Але НА ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫМ УЗРОЎНІ

МАГУТНАЙ ПЛЫНІ — ШЫРОКАЕ РЭЧЫШЧА

ДА ВЫНІКАЎ АБМЕРКАВАННЯ ПРАБЛЕМ ТЭАТРАЛЬНАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Абмеркаванне праблем развіцця драматычнай самадзейнасці на старонках нашай газеты выклікала даволі шырокі абмен думкамі. У ім прынялі ўдзел мастацкія кіраўнікі, рэжысёры, артысты народных тэатраў, тэатральныя крытыкі, драматургі, мастацтвазнаўцы і інш.

Цікавасць мастацкай грамадскасці да гэтага абмеркавання зусім зразумелая. За два з лішнім гады свайго існавання народныя тэатры заваявалі прызнанне і шырокую любоў соцень тысяч гледачоў.

Спектаклі народных тэатраў дайшлі да сэрца гледачоў не толькі таму, што яны пастаўлены на больш высокім прафесіянальным узроўні, чым у звычайных драматычных гуртках. Народ ацаніў і высокі грамадзянскі энтузіязм самадзейных артыстаў, рэжысёраў, мастакоў, якія падзяляюць сваё жыццё паміж працай і творчасцю.

Артыст народнага тэатра — гэта ў першую чаргу калгаснік, рабочы, сельскі механізатар, настаўнік, урач, заатэхнік, а пасля ўжо артыст. Большую частку часу ён аддае сваёй асноўнай працы, і толькі вольны ад вытворчасці і сям'і час ён прысвячае мастацкай творчасці. І трэба быць максімальна арганізаваным, трэба бязмежна любіць мастацтва, каб зусім бескарысліва аддаваць яму частку свайго жыцця, свае сілы.

Народныя тэатры — адна з прыкмет камуністычнага Заўтра, калі творчасць будзе арганічнай патрэбай кожнага чалавека. І гэта заўтрашняе ўжо нараджаецца сёння, нараджаецца, бы тая ручаіна з горнай вяршыні, якая пасля перарастае ў паток, а паток — у шырокую водную плынь ракі.

У 1962 годзе ў нашай рэспубліцы плануецца 34 народныя тэатры, і колькасць іх будзе павялічвацца з кожным годам. Неўзабаве народныя тэатры будуць у кожным раённым цэнтры, у кожным гарадскім пасёлку і буйных калгасных цэнтрах.

Але народзяцца яны не самі па сабе. Спатрэбяцца сур'ёзныя арганізацыйныя і творчыя намаганні, каб гэтая плынь выйшла на шырокі прастор. Гэта сцвердзілі і шматлікія выступленні на старонках нашай газеты. У ходзе абмеркавання высветлілася, што сённяшняе становішча народных тэатраў рэспублікі патрабуе актыўнай дапамогі ўсёй грамадскасці, без якой далейшы іх рост будзе сур'ёзна адставаць. Неабходнасць такой дапамогі адчуваецца ва ўсіх галінах дзейнасці народных тэатраў.

Можна лёгка ўявіць: год праз колькі нашы раённыя цэнтры і рабочыя пасёлкі стануць яшчэ прыгажэйшымі і ўпрыгожаць іх перш-наперш будынкі, якіх сёння яшчэ няма там.

У асобным прыгожым будынку будзе народны тэатр, поруч з ім размесціцца будынак кінатэатра, а непадалёк — Дом культуры для масавай самадзейнасці.

Так будзе, абавязкова будзе, а пакуль і народны тэатр, і кіно, і масавая самадзейнасць месцяцца ў адным і тым жа раённым Доме культуры. І ў гэтых умовах вельмі ўскладняецца работа народных тэатраў. Ускладняецца яна яшчэ і тым, што не ўсе кіраўнікі РДК лічаць народныя тэатры сваёй роднай і кроўнай справай. Для іх важней «пракруціць» лішні кінасеанс, пад гучнай рэкламай «вечара адпачынку» арганізаваць платныя танцы, чым паказаць спектакль. Ад кіно і танцаў яны маюць «жывую капейку», а спектакль амаль нічога не дае для фінансавага плана РДК. І колькі часу, сілы і энергіі даводзіцца траціць кіраўнікам народных тэатраў, каб праводзіць рэпетыцыі і паказваць свае спектаклі на сцэне РДК.

Загадчыкам дамоў культуры, вядома, цяжка спланаваць работу клуба так, каб задаволіць усіх, але ж нельга 25—28 дзён у месяц «круціць» толькі адно кіно, як гэта правільна зазначае М. Колас у артыкуле «Гэтыя пытанні не церпяць адкладу».

Адсутнасць сваёй сталай базы, дзе можна было б планава праводзіць рэпетыцыі, творчыя заняткі, рыхтаваць і паказваць спектаклі — адна з найбольшых цяжкасцей у сённяшнім жыцці народных тэатраў. Пераадолець яе без дапамогі мясцовых партыйных і грамадскіх арганізацый бадай немагчыма. Там, дзе ёсць народныя тэатры, работу РДК трэба ўзяць пад грамадскі кантроль, каб усе віды мастацкай самадзейнасці і ў першую чаргу — народныя тэатры мелі хоць элементарна неабходныя ўмовы для нармальнай працы. У гэтым мусяць быць зацікаўлены і савет РДК і кіраўніцтва раённага аддзела культуры, якое часам таксама патурае кінапракатным захапленням загадчыкаў РДК.

У гэтай сувязі заслугоўвае сур'ёзнай увагі ідэя «адкрытых дзвярэй», што ўзнікла ў ходзе абмеркавання. Некаторыя таварышы прапануюць адмовіцца ад платных спектакляў у народных тэатрах, а сродкі, неабходныя для нармальнай працы тэатра, чэрпаць з адлічэнняў ад культфондаў прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў. Думаецца, што гэтая прапанова мае ў сабе здаровае зерне. Тым больш, што вялікія сумы культфондаў часта выдаткуюцца не па свайму прызначэнню.

Народныя тэатры ўзніклі ў выніку высокіх культурных запатрабаванняў народа. Чаму ж яны мусяць быць у горшым становішчы, чым іншыя культурныя ўстановы, якім вызначаецца матарыяльная дапамога?

І вось, калі б народныя тэатры існавалі на сродкі культфондаў, то арганізацыі, якім падначалены клубы і дамы культуры, былі б заклапочаны, каб яны больш нармальна працавалі і часцей выступалі са сваімі спектаклямі. Пры такім жа становішчы, калі народныя тэатры існуюць самі па сабе, прадпрыемствы, раённыя і абласныя аддзелы культуры не нясуць матэрыяльнай адказнасці за народныя тэатры, бо любому раённаму аддзелу культуры куды большая выгада «пракруціць» лішні сеанс, чым паказаць спектакль.

Гэту камерцыйную практыку, між іншым, трэба рашуча ламаць. Колькі ёсць нараканняў з боку прафесіянальных тэатраў і канцэртных арганізацый рэспублікі, што многія кіраўнікі РДК з ведама начальнікаў раённых аддзелаў культуры не даюць сцэну для выязнога спектакля ці філарманічнага канцэрта толькі таму, што спектакль і канцэрт амаль нічога не даюць для фінансавага плана.

Ці не шмат ужо развялося ў нашых раённых установах культуры кіраўнікоў, якія за лішні рубель гатовы заглушыць усё, што не звязана з кіно і танцамі? Міністэрству культуры БССР, відаць, даўно пара навесці парадак у карыстанні памяшканнямі РДК і тым самым стварыць мясцовай самадзейнасці, а ў першую чаргу—народным тэатрам, большыя магчымасці для нармальнай працы.

Нармальнай дзейнасці народных тэатраў перашкаджаюць яшчэ іншыя прычыны. Многія кіраўнікі прадпрыемстваў і устаноў не адпускаюць сваіх рабочых і служачых — удзельнікаў самадзейнасці на рэпетыцыі і спектаклі, тым больш на выязныя. Даходзіць да таго, што ў асобных выпадках даводзіцца звяртацца за дапамогай да раённых і гарадскіх партыйных камітэтаў.

Такое становішча трэба прызнаць абсалютна ненармальным і пажадана, каб Белсаўпроф як мага хутчэй і перш-ым прыйшоў на дапамогу ў гэтай справе, бо ён мае поўную магчымасць перавесці ўдзельнікаў самадзейнасці з вячэрніх і начных змен на дзённыя, уладкаваць з адміністрацыяй пытанні з выязнымі спектаклямі, канцэртамі і інш.

Сказаць праўду, дык тут многа вінаваты і самі народныя тэатры. Яны не маюць яшчэ ярка акрэсленага грамадскага аблічча, не абраслі грамадскім актывам.

Каб кожны народны тэатр меў мастацкі савет з прадстаўнікоў партыйных, грамадскіх, камсамольскіх арганізацый і прамысловых прадпрыемстваў,— у яго была б шырокая апора і ўсебаковая падтрымка. Відаць, гэтага яшчэ няма і справа даходзіць часам да анекдатычных выпадкаў, калі некаторыя мясцовыя кіраўнікі не ведаюць, што гэта такое — народны тэатр. А не ведаюць, відаць таму, што сам тэатр яшчэ не «заявіў» аб сабе, не глыбока пранік сваімі карэннямі ў грамадскае жыццё. Народным тэатрам трэба часцей сустракацца са сваімі гледачамі, раіцца з імі, цікавіцца іх думкамі і патрабаваннямі да мастацтва, абмяркоўваць свае спектаклі, рэпертуарныя планы, акцёрскія работы, не баючыся пры тым шырокай грамадскай крытыкі, і тады тэатр стане не толькі творчай, а і грамадскай з'явай.

І ўнутры кожнага калектыву, з кожнага самадзейнага артыста трэба выхоўваць не толькі таленавітага выканаўцу, а і грамадска-культурнага дзеяча.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Жывапіс, ткацтва, кераміка, скульптура

У памяшканні Мінскага Палаца культуры прафсаюзаў адкрылася выстаўка работ самадзейных майстроў выяўленчага і прыкладнога мастацтва Мінскай вобласці. Народныя ўмельцы прысвячаюць свае творы XXII з'езду роднай Камуністычнай партыі.

Тут прадстаўлены жывапіс, скульптура, ткацтва, разьба па дрэву мастацкая вышыўка і інш. Усяго каля 300 работ.

Сярод экспанатаў карціны, пейзажы і эцюды самадзейных мастакоў С. Мірзаяна, М. Шчалканогава, В. Хадасоўскага, К. Кізаева, І. Клюйко, Л. Раманава, В. Наумовіча, лінагравюры В. Садзіна, кераміка Івянецкіх умельцаў і інш.

«Будаўніцтва камбіната». Лінагравюра служачага г. Слуцка В. Садзіна і скульптура «Слесар» самадзейнага майстра П. Герасіменкі з саўгаса «Даўгінава».

Падзеі. Факты. Навіны

□ Спектаклем па п'есе В. Шаўрына «Салдаты» адкрыўся новы сезон у Гродзенскім абласным рускім драматычным тэатры. У канцы гэтага месяца тэатр пакажа працоўным абласнога цэнтра прэм'еру спектакля «Ад шчодрасці сэрца» па п'есе В. Левантоўскай.

У новым сезоне будзе ажыццёўлена таксама пастаноўка спектакляў «Яблык разладу» М. Бірукова, «Згублены сын» А. Арбузава, «Адзін год» Ю. Германа і Б. Рэста, «Чырвоныя д'ябаляты» П. Бляхіна, А. Палявога і А. Таубэіна і раду іншых.

□ «Музыка і сродні яе выразнасці». Лекцыі-канцэрты на гэтую тэму адбыліся ў Гомельскім Палацы чыгуначнікаў імя Леніна. Перад слухачамі універсітэта культуры і школьнікамі горада выступіла музыказнаўца Т. Шчарбакова. Творы беларускіх кампазітараў, рамансы і арыі з опер рускіх і заходне-еўрапейскіх аўтараў, інструментальныя п'есы выканалі М. Пушкароў, С. Вялькевіч, В. Зямераў.

□ У Доме культуры Мінскага аўтазавода адбылася музычная лекцыя для школьнікаў. Аб музыцы для дзяцей юным слухачам расказаў музыказнаўца І. Нісневіч. Быў наладжаны канцэрт, у праграму якога ўвайшлі песні беларускіх, савецкіх і зарубежных аўтараў.

ДЗЕЦЯМ — ПРЫГОЖУЮ МУЗЫКУ

Музычнае выхаванне дзяцей стала часткай вялікай эстэтычнай праграмы. Музычных школ у нас нямала, але яны не могуць задаволіць велізарнае імкненне нашых дзяцей да музыкі. Таму многія з іх наведваюць гурткі мастацкай самадзейнасці, музычныя студыі пры палацах культуры. І цяпер, можа больш, чым калі, юныя музыканты маюць патрэбу ў новым навучальна-педагагічным рэпертуары, якога пакуль вельмі мала.

Рэпертуар агульнаметадычнага характару, у прыватнасці, п'есы і эцюды Чэрні, Клеменці, Кулау, Гедзіке, перыядычна выдаецца ўсесаюзнымі музычнымі выдавецтвамі, і ён яшчэ бывае ў продажы. Дзяржвыдавецтва БССР таксама зрэдку спрабуе перавыдаваць некаторыя зборнікі. І гэта правільна.

Аднак, маюцца на ўвазе не адны толькі эцюды і п'есы, якія дапамагаюць выпрацоўваць тэхнічныя навыкі ў вучняў, развіваюць бегласць і натуральнасць ігры на тым ці іншым інструменце. Хоць, вядома, і такія творы патрэбны, бо яны выхоўваюць у дзяцей музычны густ, прышчапляюць ім эстэтычныя навыкі. Але найбольшае патрабаванне да навучальнай праграмы музычных школ — гэта, каб вучні ўсебакова пазнаёміліся з творамі савецкай, у тым ліку беларускай музыкі. А выканаць гэтае патрабаванне выкладчыкам музычных школ бывае вельмі цяжка, таму што выдадзена гэтых твораў у нас вельмі мала. Выкарыстоўваліся ў асноўным ранейшыя выдадзеныя зборнікі інструментальных і вакальных п'ес П. Падкавырава, Д. Камінскага, Р. Анчыкава, В. Жубінскай і іншых беларускіх аўтараў.

Толькі за апошні час Дзяржаўнае выдавецтва БССР наладзіла больш-менш сістэматычны выпуск дзіцячай музычнай літаратуры беларускіх кампазітараў.

Значную цікавасць маюць нядаўна выпушчаныя нашым выдавецтвам «Дзіцячыя п'есы для фартэпіяна» Л. Абеліёвіча, зборнік «Юны скрыпач» М. Шнейдэрмана і «Поры года» (песні для дзіцячага хору) В. Жубінскай. Большасць твораў гэтых трох зборнікаў напісаны з густам і даволі цікава. Яны вабяць сваёй меладычнасцю, цэласнасцю музычных вобразаў і карцін. Многія з п'ес эроблены выкананлівы ў сэнсе спалучэння розных тэхнічных прыёмаў.

Навучальныя праграмы музычных школ патрабуюць, каб дзеці абавязкова іграл і творы беларускіх кампазітараў. Але многія дзіцячыя музычныя п'есы, выдадзеныя ў рэспубліцы, хоць і напісаны беларускімі аўтарамі, амаль не маюць нацыянальных рысаў, апроч таго, у іх адсутнічаюць якія-небудзь адзнакі сучаснай музычнай мовы. Часцей за ўсё аўтары пішуць дзіцячыя п'есы па даўно ўжо выпрацаваных каноках, у духу вядомых п'ес, створаных калісьці для дзяцей і юнацтва кампазітарамі-класікамі. Сучасныя ж назвы гэтых твораў прышыты белымі ніткамі.

Вядома, класічную і сучасную музыку нельга адгароджваць і процілаштаўляць адна адной. Вучні павінны добра разбірацца ў стылі Баха, Бетховена, Чайкоўскага. Але побач з гэтым нашы юныя піяністы, скрыпачы, цымбалісты павінны разумець і сучасную музыку, перш за ўсё савецкіх кампазітараў, бо выхаванне густу да сучаснага музычнага стылю мае прынцыпова важнае значэнне. Не сакрэт, што іншы раз нават сярод музычна падрыхтаваных людзей сустракаюцца слухачы, якія не ўспрымаюць сучасную музыку. Класіка ёсць класіка, але на ёй жа не канчаецца працэс развіцця музычнага мастацтва. А што мы робім для таго, каб папулярызаваць і распаўсюджваць узоры перадавога мастацтва сучаснасці, дасягненні ў савецкай музыцы? На жаль, нават самі кампазітары не заўсёды клапоцяцца аб гэтым і не прыкладаюць намаганняў для выхавання ў слухачоў высокіх эстэтычных густаў.

А хіба гэта добра, што нашы кампазітары над буйнымі творамі працуюць удумліва, сур'ёзна, больш шукаюць, праяўляюць вынаходлівасць, а ў іх дзіцячых п'есах пераважаюць прыёмы далёкага мінулага.

Зразумела, гэта датычыць не ўсіх беларускіх аўтараў. З названых трох зборнікаў зборнік Л. Абеліёвіча менш за ўсё мае такіх недахопаў. У яго творах для дзяцей, пры наяўнасці яснай апоры на традыцыйныя прыёмы меладычнага развіцця, ёсць характэрныя інтанацыі і звароты, тыповыя для сучаснай музычнай мовы. Гарманічна выпаходлівы і прывабны мініяцюрны «Марш», зроблены ў пракоф'еўскім стылі, з яго нечаканымі танальнымі зрухамі. Па-свойму прыкметныя «Козачка» і «Вясёлая гульня». Праўда, гэтыя п'есы крыху складаныя для дзіцячага ўспрыняцця, і хацелася б бачыць у іх больш гарманічнай яснасці. Увогуле ж яны яркія і дасціпныя. Вобразны лад і музычная мова п'ес Л. Абеліёвіча дастаткова арыгінальныя і сучасныя.

Некалькі абыякавымі ў гэтых адносінах выглядаюць п'есы для скрыпкі М. Шнейдэрмана. Меладычныя, напісаныя рукой прафесіянала, яны ўсё ж у большасці нясуць адбітак «мілага старога» стылю. Асабліва гэтым грэшаць такія п'есы, як «Мазурка», «Расказ бабулькі» і некаторыя іншыя.

Дарэчы, пра назвы п'ес у зборніках М. Шнейдэрмана і Л. Абеліёвіча. Назвы большасці гэтых дзіцячых твораў: «Танец», «Романс», «Скерцына», «Жарт», «Марш» — самі па сабе нясуць ідэю музычнай праграмнасці, садзейнічаюць больш канкрэтнаму і вобразнаму ўспрыняццю інструментальных п'ес пачынаючымі музыкантамі. Аднак зноў такі тут назіраецца імкненне ў першую чаргу адштурхнуцца ад вобразаў, якія даўно ўстанавіліся і часта паўтараюцца. Па-за ўвагай кампазітараў застаюцца многія з'явы і падзеі сучаснага жыцця, надзвычай калярытныя і характэрныя, якія маглі б быць увасоблены ў дзіцячых п'есах. А з беларускай тэматыкай звязана, здаецца, наогул толькі адна п'еса — «Варыяцыі на беларускую тэму» М. Шнейдэрмана.

Дзіцячыя песні В. Жубінскай прыемна спяваць, і ў гэтым іх першая несумненная вартасць. Праўда, у некаторых песнях парушаны нормы натуральнага пераходу з адной танальнасці ў другую. Так, у песні «Звіняць канькі» ў пачатку прыпеву наўрад ці будзе лёгка перайсці з танальнасці рэ мажор у танальнасць сі бемоль мажор. Але ўвогуле песні Жубінскай пластычныя і натуральныя.

Разам з тым, у гэтых песнях менш відаць індывідуальная асаблівасць творчасці кампазітара, якая, напрыклад, ярка праявілася ў фартэпіянным канцэрце Жубінскай. У ім яна куды больш шчодрая на музычныя знаходкі, чым у дзіцячых песнях. Нам, здаецца, няма нічога дрэннага ў тым, што ў некаторых песнях можна сустрэць вобразы і музыку, разлічаныя на больш сталае ўспрыняцце. Дастаткова прыгадаць у сувязі з гэтым прыклады з класікі: п'есы «Дзіцячага альбома» Чайкоўскага з'яўляліся па сутнасці аблегчанымі (у добрым сэнсе гэтага слова) варыянтамі яго больш сур'ёзных твораў.

Але патрабаванне ад кожнага аўтара сучаснасці, індывідуальнасці музычнай мовы, і ў першую чаргу — яснай меладычнасці і прыгажосці музыкі ў дзіцячых творах застаецца самым галоўным. І да гэтага трэба ўсяляк імкнуцца нашым кампазітарам.

В. ЯЛАТАЎ,
кандыдат мастацтвазнаўства.

МАГУТНАЙ ПЛЫНІ — ШЫРОКАЕ РЭЧЫШЧА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Але аўтарытэт і грамадскае аблічча мае і будзе мець толькі той калектыў, на чале якога стаіць не проста рэжысёр, а і грамадскі дзеяч — палымяны энтузіяст сваёй справы. Такі рэжысёр будзе сваім чалавекам на суседнім заводзе, фабрыцы, райпрамкамбінаце, у школе, установе, калгасе. Куды б ён ні зайшоў па ўзнікшых патрэбах тэатра,— яму ні ў чым не адмовяць ні дырэктар прадпрыемства, ні старшыня калгаса, бо яны палюбілі ўжо тэатр, якім кіруе гэты рэжысёр.

Іншая справа, што такіх рэжысёраў пакуль яшчэ вельмі мала. І наогул, праблема рэжысёрскіх кадраў для народных тэатраў сёння, як паказала абмеркаванне, яшчэ далёка не вырашана. Рэжысёраў ужо і сёння нестае, ды і дзе іх узяць, калі Тэатральна-мастацкі інстытут у Мінску рыхтуе (і то вельмі мала) рэжысёраў толькі для прафесіянальных тэатраў. Інстытут не можа стаяць у баку ад такога велізарнага культурнага руху, якім з'яўляецца арганізацыя і творчасць народных тэатраў. Яго ўдзел і дапамога ў гэтай справе могуць узняць тэатральную самадзейнасць сапраўды на прафесіянальны ўзровень, якога ўжо сёння дамагаюцца народныя тэатры.

Паўстае пільная неабходнасць пашырыць рэжысёрскі факультэт інстытута, каб ён падвоіў, патроіў выпуск рэжысёраў, значную частку якіх можна было б паслаць у тэатральную самадзейнасць.

Але павялічыць выпуск можна ў лепшым выпадку не раней, чым праз 4—5 год. А рэжысёры патрэбны ўжо сёння і яшчэ большая патрэба ўзнікне праз год-два. Таму варта было б падумаць пра арганізацыю пры Тэатральна-мастацкім інстытуце хоць бы двухгадовых курсаў павышанага тыпу. На гэтыя курсы можна было б прымаць практыкаў тэатральнай самадзейнасці.

На чале тэатральнай самадзейнасці неабходна паставіць прафесіянальнае кіраўніцтва, інакш пытанне «Самадзейнасць? Так. Але на прафесіянальным ўзроўні», пастаўленае ў пачатку нашага абмеркавання, безнадзейна павісне ў паветры.

А пакуль тыя курсы ці рэарганізацыя рэжысёрскага факультэта, клопаты пра тэатральную самадзейнасць у значнай меры павінны ўзяць на сябе прафесіянальныя тэатры. Трэба ж сказаць праўду: да гэтага часу яны памагалі самадзейнасці больш дэкларатыўна, чым практычна. Асобныя выпадкі сапраўднай дапамогі носяць характар філантрапічнай дзейнасці, у той час, як дапамога патрэбна сістэматычная і разнабаковая.

Высокі прыклад грамадскага абавязку перад самадзейнасцю паказалі нашы вядомыя артысты і рэжысёры — Б. Платонаў, К. Саннікаў, Л. Шынко, В. Пола, Ц. Сяргейчык, А. Радзялоўская і некаторыя іншыя.

Але гэты высакародны пачын пакуль не падхоплены. Між тым, нават цяжка ўявіць, якая велізарная карысць будзе, калі кожны акцёр, рэжысёр ці мастак хоць бы адзін раз у год пабывае ў народным тэатры і паможа яму сваёй кансультацыяй ці практычнай працай.

Трэба спадзявацца, што нашы тэатры знойдуць сілы, магчымасці і рэзервы, каб, пачынаючы з новага сезона, які будзе праходзіць пад натхняючым уплывам рашэнняў XXII з'езда партыі, зрабіць самадзейнасць неад'емнай часткай свайго жыцця. Часам можна пачуць думку, што ў будучым народным тэатры поўнасцю заменяць прафесіянальныя, таму ці варта клапаціцца аб іх узаемасувязі, паколькі народны тэатр пойдзе сваімі шляхамі. Такая думка нічога агульнага не мае з сапраўднай перспектывай развіцця самадзейнага і прафесіянальнага мастацтва.

Прафесіянальны тэатр заўсёды ўзбагачаў і будзе ўзбагачаць самадзейнасць прафесіянальнай і творчай культурай, без якой сённяшняя самадзейнасць ужо не можа існаваць. Тэатр з'яўляецца і заўсёды будзе з'яўляцца маяком для самадзейнасці, на які яна будзе раўняцца.

Таму тэатры павінны зразумець сваю вялікую адказнасць за лёс самадзейнасці яшчэ і ў сувязі з тым, якое пачэснае месца вызначае партыя народнай творчасці ў культурным жыцці працоўных.

Тэатры і тэатральная самадзейнасць — адно цэлае, у іх адна і тая ж мэта і задача — ствараць духоўнае багацце народа. Якой бы шырокай ні была сетка прафесіянальных тэатраў, яна не можа ахапіць усе куткі рэспублікі, а тэатральная самадзейнасць пранікае да самай маленькай сельскай сцэны.

Народныя тэатры, такім чынам, сталі сёння спадарожнікамі, малодшымі братамі прафесіянальнага тэатра. І жыць ім у адной сям'і, адкрыты законамі гэтай сям'і, калі старэйшы памагае малодшаму.

Дык чаму б абласным і рэспубліканскім тэатрам па-брацку не памагчы самадзейным калектывам не толькі добрым словам, парадай, кансультацыяй, а і больш канкрэтнымі справамі. У нядаўнім абмеркаванні і раней на старонках нашай газеты неаднаразова ўзнікала гаворка пра тое, каб тэатры перадавалі самадзейным калектывам амартызаваную бутафорыю, рэквізіт, гардэроб, тое ці іншае абсталяванне, тым больш, што па гэтаму пытанню ёсць нават спецыяльны загад Міністэрства культуры БССР. Пакуль што тэатры неахвотна ідуць на такія аперацыі і не хочуць разумець, што скарыстаны касцюм ці бутафорыя, якая часам проста валяецца без усякай патрэбы, у народным тэатры могуць выратаваць становішча.

Матэрыяльная дапамога самадзейным калектывам — пытанне вельмі сур'ёзнае. Бюджэт народных тэатраў такі абмежаваны, што яны не маюць магчымасці набываць усё неабходнае для афармлення спектакля. Многія калектывы з вялікай цяжкасцю знаходзяць сродкі і матэрыялы для пастановак. Тэатры ж могуць намнога паслабіць гэтыя, часам непераадольныя цяжкасці, якія забіраюць шмат творчай энергіі і часу.

Кожны абласны і рэспубліканскі тэатр набывае п'есы для свайго рэпертуару, выпісвае часопіс «Театр», альманах «Современная драматургия», купляе асобныя выданні п'ес. Зразумела, што не ўсе тыя п'есы тэатр ставіць і многа іх пыляцца ў тэатральных шафах, у кабінетах дырэктараў і галоўных рэжысёраў.

У той жа час народнаму тэатру часам бывае цяжка набыць новую п'есу. Чаму б тэатрам не ўзяць шэфства над самадзейным калектывам і ў справе арганізацыі яго рэпертуару? У прафесіянальным тэатры лепш ведаюць, дзе і якія з'явіліся новыя п'есы, наколькі яны прыдатныя для самадзейнай сцэны. І каму, як не тэатру, памагчы набыць гэтыя п'есы і параіць лепшыя з іх для пастаноўкі.

Удзельнікі абмеркавання вызначылі народны тэатр як тэатр сучаснасці і зусім слушна лічаць, што найлепшай задачай народных тэатраў мусіць быць пастаноўка савецкіх п'ес. Гэта, да рэчы, не выключае магчымасці пастаноўкі і класічных п'ес, калі той ці іншы калектыў набыў пэўны вопыт. Але сучаснасць — найбольш правільны кірунак у рабоце тэатральнай самадзейнасці і дзяржаўныя тэатры могуць памагчы трымацца гэтага кірунку.

Кожны самадзейны калектыў мусіць мець шырокі выбар п'ес, каб знайсці сярод іх патрэбныя для свайго рэпертуару. І можа сапраўды дазволіць народным тэатрам заключаць умовы з драматургамі на напісанне п'ес спецыяльна для іх, як гэта практыкавалі некаторыя таварышы, бо не сакрэт, што нашы драматургі пішуць п'есы, разлічваючы на прафесіянальную сцэну. І не кожная такая п'еса прыдатная для самадзейнага калектыву. Для народнага тэатра патрэбна п'еса з улікам усіх яго асаблівасцей.

А яшчэ было б, лепш, каб самадзейныя тэатры выхоўвалі сваіх драматургаў, узнімалі ў спектаклях свае тэмы, бо ў кожным раёне, у кожным калгасе ёсць цікавыя людзі, падзеі, свая гісторыя і напэўна ж ёсць таленты, якія могуць расказаць пра ўсё гэта ў драматычных вобразах. Многія пачынаючыя аўтары з калгасаў, саўгасаў, раённых цэнтраў прысылаюць свае п'есы ў рэдакцыі рэспубліканскіх часопісаў, у Саюз пісьменнікаў ці то проста—ў дзяржаўны тэатр. А чаму б каторараму з іх не паслаць п'есу ў свой народны тэатр ці проста—у бліжэйшы драматычны калектыў? Няхай у гэтым калектыве драматург не атрымае глыбокай кваліфікаванай дапамогі, але ён сустрэне там людзей, якія ўзнімуць яго намер на крылах энтузіязму. Няўжо наша самадзейнасць заклікана вырошчваць толькі выканаўцаў? Яна павінна выхоўваць і творцаў.

Народныя тэатры будуць мець не толькі сваю драматургію, але і сваіх драматургаў.

Рэспубліканскі дом народнай творчасці праводзіць часам конкурс на аднаактовыя п'есы для самадзейных гурткоў. Сёння Міністэрству культуры БССР і Саюзу пісьменнікаў варта падумаць, каб правесці конкурс на п'есу для народных тэатраў, звярнуўшы для ўдзелу ў ім шырокія масы інтэлігенцыі.

Шмат іншых неадкладных пытанняў паставілі нашы аўтары ў ходзе абмеркавання праблем развіцця тэатральнай самадзейнасці.

Рэдакцыя газеты выказвае ім глыбокую ўдзячнасць, спадзяецца, што Міністэрства культуры БССР, Белсаўпроф і іншыя арганізацыі і ўстановы, якія зацікаўлены ў развіцці народнай самадзейнасці, абмяркуюць найбольш важныя пытанні, пастаўленыя нашымі аўтарамі і зробяць практычныя захады.

У ПЕРШЫНЮ

Даць чытачу магчымасць грунтоўна пазнаёміцца з беларускай паэзіяй, мець больш-менш поўнае ўяўленне аб яе асаблівасцях і поспехах, аб яе мастацкай вартасці, данесці да чытача яе неабдымнае багацце — такую задачу паставілі перад сабой укладальнікі «Анталогіі беларускай паэзіі», якая ў хуткім часе выйдзе ў Беларгяржвыдавецтве.

Такое выданне ажыццяўляецца ў рэспубліцы ўпершыню. Яно складаецца з трох тамоў і будзе змяшчаць узоры багацяў беларускай паэзіі ад часоў Ф. Скарыны да нашых дзён.

Складзена «Анталогія» па храналагічнаму прынцыпу. Першы том, укладальнікамі якога з'яўляюцца С. Александровіч і Ю. Пшыркоў, знаёміць чытача з узорамі нашай паэзіі ад старажытнага часу да Кастрычніцкай рэвалюцыі, уключаючы творчасць Я. Купалы і Я. Коласа. Адкрываецца ён прадмовай К. Крапівы і В. Барысенкі, якая коратка расказвае аб шляхах развіцця і станаўлення беларускай паэзіі. У сівой мінуўшчыне яе вытокі. Яшчэ ў пачатку XVI стагоддзя ў Беларусі ўзнікла так званая віршавая паэзія. Да яе звяртаўся наш першадрукар Францішак Скарына; паэзіяй — Памва Бярында, Афанасій Філіповіч і іншыя культурна-асветныя дзеячы XVI—XVII стагоддзяў. Прыкметны след у віршавай паэзіі пакінуў першы асветнік, вучоны і паэт Маскоўскай Русі Сімеон Полацкі. Побач з вершамі пераважна на царкоўна-рэлігійныя тэмы да пачатку XVII стагоддзя адносяцца таксама і першыя спробы грамадзянскай лірыкі — вершаў грамадска-гістарычнага гучання.

У XVII стагоддзі беларускія землі трапляюць пад уладу польскіх паноў, якія ўсімі сродкамі стараліся задушыць праявы нацыянальнага і культурнага развіцця беларусаў. Літаратурнае жыццё на тэрыторыі Беларусі на доўгі час замірае. І толькі далучэнне Беларусі ў канцы XVIII стагоддзя да Расіі дало новы штуршок для яго развіцця. Ужо ў 20—30-х гадах XIX стагоддзя з'яўляюцца ананімныя лірычныя вершы «Багач», «Праўда», гутарка «Скачы, вяльможны пане!», вершаванае апавяданне «Чортава сіла» і вядомыя парадыйныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе».

Крыху пазней з'яўляюцца антыпрыгонніцкія ананімныя гутаркі «Панская ласка» і «Гутарка Данілы са Сцяпанам», а да сярэдзіны XIX стагоддзя беларуская літаратура, у тым ліку і паэзія, зноў становіцца друкаванай і паступова губляе сваю безымяннасць.

Адным з першых беларускіх паэтаў быў Паўлюк Багрым. У 40-я гады пішуць свае лірычныя вершы Ян Чачот і Ян Баршэўскі, пачынае сваю літаратурную дзейнасць В. Дунін-Марцінкевіч, аўтар вершаваных апавяданняў «Вечарніцы», «Купала» і паэмы «Гапон».

Звяртаецца да вершаў у мэтах рэвалюцыйнай прапаганды кіраўнік паўстанцкага руху на Беларусі Кастусь Каліноўскі.

Але найбольш яркія нацыянальныя рысы і дэмакратычную накіраванасць беларуская паэзія набывае ў творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча, Ф. Тапчэўскага.

«Новы перыяд у гісторыі беларускай літаратуры, — як адзначаў яшчэ М. Багдановіч, — мае зыходным пунктам 1905 год, які зрабіў глыбокі пераварот у псіхіцы народных мас...» Імкнена пярэддзень першай рускай рэвалюцыі выклікаў да жыцця паэзію Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, Ц. Гартнага, Зм. Бядулі, М. Багдановіча. К. Буйла, Я. Журбы, А. Гурло.

Аб бурным росквіце беларускай паэзіі пасля вялікага Кастрычніка дае ўяўленне другі том «Анталогіі», складзены М. Лужаніным і Р. Бярозкіным. Рэвалюцыя раскавала невычэрпныя народныя таленты, абудзіла ад векавога сну драмаўшыя сілы народныя. Небывалы штуршок атрымала беларуская літаратура для свайго развіцця.

Плённа працуюць у першыя гады Савецкай улады паэты старэйшага пакалення. Стварае «Безназоўнае» Я. Купала, працуе над «Новай зямлёй» і «Сымонам-музыкам» Я. Колас, называе сябе «барабаншчыкам рэвалюцыі» Ц. Гартны. Побач з імі спявае рэвалюцыйныя гімны першы пралетарскі паэт Беларусі М. Чарот. У паэзію прыходзяць К. Крапіва, Ул. Дубоўка, А. Александровіч, А. Дудар, Я. Пушча, крыху пазней—П. Трус, П. Глебка, П. Броўка, М. Лужанін, З. Астапенка, Ю. Таўбін, А. Куляшоў, А. Звонак, Ул. Хадыка, М. Хведаровіч.

1939 год прыносіць нашай паэзіі новае моцнае папаўненне — паэтаў-змагароў заходніх абласцей Беларусі М. Танка, В. Таўлая, П. Пестрака, М. Васілька, М. Машару, М. Засіма.

Суровае выпрабаванне, якое выпала на долю нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, беларуская паэзія сустрэла выдатнымі дасягненнямі. Да вайны і асабліва ў часе вайны надзвычай пашырыліся яе тэматыка, яе творчы дыяпазон, адвастрылася майстэрства нашых паэтаў. Беларуская паэзія ўпэўнена выйшла на міжнародную арэну.

І хоць за час вайны яна панесла вялікія страты — не стала Я. Купалы і Зм. Бядулі, не вярнуліся з франтоў А. Жаўрук, А. Ушакоў, Л. Гаўрылаў, А. Коршак, А. Гейнэ, У. Рагуцкі — наша паэзія выйшла на рыштаванні пасляваеннага будаўніцтва яшчэ больш узмужнелай, узмацнелай і колькасна, і якасна.

Плённа папрацавалі беларускія паэты за мінуўшыя пасля вайны гады. Пералічыць, што зроблена імі, немагчыма, ды, бадай, і не патрэбна. Поспехі нашай паэзіі вядомы кожнаму больш-менш дасведчанаму чытачу.

Не спыняе яна свайго імкліваго поступу і ў нашы дні. Кожны год у ёй з'яўляюцца ўсё новыя і новыя імёны паэтаў розных почыркаў і талентаў, па-свойму арыгінальных і цікавых. Толькі за апошнія некалькі гадоў станоўча паказалі сябе ў паэзіі С. Гаўрусёў, Р. Барадулін, Ул. Караткевіч, Е. Лось, А. Лойка, Хв. Жычка, Ул. Нядзведскі, Г. Бураўкін, К. Цвірка, Д. Бічэль і іншыя. Трэці том новай «Анталогіі» — самы насычаны, самы мнагалікі— і раскажа пра творчасць сучасных беларускіх паэтаў. Складзены ён А. Вялюгіным.

Укладальнікі «Анталогіі» імкнуліся як мага паўней адлюстраваць агульны стан нашай паэзіі і індывідуальныя рысы творчасці кожнага паэта. Гэтым у асноўным вызначаўся прынцып адбору тых ці іншых твораў. Я. Купала, напрыклад, прадстаўлен у кнізе паэмай «Безназоўнае» і вершамі; Я. Колас — урыўкамі з «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі», а таксама лепшымі вершамі; М. Чарот — паэмай «Босыя на вогнішчы» і нізкай вершаў.

На старонках трохтомнай «Анталогіі» шырокія колы чытачоў сустрэнуцца з такімі мала вядомымі аўтарамі, як А. Абуховіч, А. Паўловіч, К. Каганец, Г. Леўчык, А. Петрашкевіч, Стары Улас, А Дзяркач, А. Вольны, А. Моркаўка, У. Жылка, Я. Туміловіч, Я. Бобрык, А. Салагуб, С. Дарожны, З. Піваваў, С. Фамін, В. Казлоўскі, А. Дубровіч, С. Крывец, А. Гейнэ, А. Коршак і інш.

Выданне забяспечана кароткімі біяграфічна-бібліяграфічнымі даведкамі і партрэтамі аўтараў. Вершы суправаджаюцца датамі іх напісання. У трэцім томе дадзен падрабязны алфавітны ўказальнік.

Новая «Анталогія беларускай паэзіі» абяцае быць сапраўдным вянком фарбаў і гукаў роднага краю. І таму хочацца ад душы пажадаць: «Да хуткай і прыемнай сустрэчы!»

Рысы нашага жыцця

МІНСК — ЦАЛІНАГРАД

Не першы год існуюць цесныя сяброўскія сувязі паміж працоўнымі Беларусі і Цаліннага краю.

Нядаўна Міністэрства культуры БССР і Прэзідыум Беларускага савета прафсаюзаў прынялі пастанову аб перадачы цалінінкам 150 тысяч экземпляраў грамадска-палітычнай, мастацкай і іншай літаратуры на рускай і беларускай мовах.

Бібліятэкі рэспублікі пачалі работу па збіранню кніг ад насельніцтва, па адбору з фондаў дублетнай літаратуры. Актыўна ўдзельнічаюць у гэтым мерапрыемстве масавыя бібліятэкі Мінска. Бібліятэкі імя Гогаля і імя Маяноўскага сабралі ад насельніцтва ўжо звыш 1000 экземпляраў рознай літаратуры. 220 кніг сабралі пакарыцелям цаліны чытачы тт. Стажарава і Іванова.

Звыш 1300 экземпляраў кніг сабралі работнікі масавых бібліятэк імя Крупскай, № 1 Сталінскага раёна і № 2 Кастрычніцкага раёна.

На пункты збору літаратуры ўвесь час паступаюць сотні і сотні новых кніг.

Загадчыца бібліятэкі імя Маяноўскага А. Пазнякова прымае літаратуру ад хатняй гаспадыні А. Кісялёвай, пенсіянеркі Р. Тышко, навучэнкі рамесніцкага вучылішча № 5 Л. Матусевіч.

Кожная з іх падарыла цалінінкам больш за два дзесятні кніг.

САРДЭЧНЫЯ ЛЮДЗІ

Марыя Міхайлаўна Глінская жыве ў Бабруйску па вуліцы Карла Маркса ў доме № 147 разам са сваёй 86-гадовай маці і дачкой Людай. Старэйшая дачка Жана працуе ў Віцебску. Здаецца, не вельмі ўжо Марыя Міхайлаўна сябравала з таварышамі па рабоце. У госці да іх не хадзіла. А вось здарылася няшчасце, і яна адразу адчула сапраўдныя клопаты людзей, з якімі працавала.

Нечакана Глінская атрымала тэлеграму: «Неадкладна выязджайце ў Віцебск, дачка Жана цяжка захварэла». Яна пайшла ў кантору дзіцячай выхаваўча-працоўнай калоніі прасіць дазвол на нечаргові адпачынак. Моцна хвалявалася, да таго ж не ведала, на каго пакінуць старую маці і меншую дачку.

А таварышы па службе сказалі:

— Можаце, Марыя Міхайлаўна, ехаць спакойна, мы без увагі не пакінем вашу сям'ю.

І яна паехала...

Тым часам на рабоце неадкладна склікалі мясцком. 30 чалавек былі ўключаны ў графік дзяжурстваў па дому Глінскай — па два на дзень. Але тут здарылася новая бяда. Старая маці Марыі Міхайлаўны цяжка захварэла. На працягу некалькіх месяцаў ёй нельга было ўставаць з ложка.

— Нельга цяпер хваляваць Глінскую новай горкай весткай, — рашылі яе таварышы С. Панявіна, О. Маркусенка, Л. Арцюшына, К. Волах, С. Шалімава і іншыя.

Яны самі паклапаціліся аб урачах, медыкаментах, кругласутачна дзяжурылі ля хворай. Акрамя сродкаў, якія выдзяліў мясцком, з уласных зберажэнняў сабралі значную суму на лячэнне старой.

Калі Марыя Міхайлаўна вярнулася дадому, таварышы не толькі выхадзілі яе хворую маці, але і зрабілі неабходны рамонт у кватэры.

Усюды жывуць і працуюць нашы цудоўныя савецкія людзі, якія гатовы ў любую хвіліну дапамагчы таварышу.

М. МІХАЛЮТА.



Фотакарэспандэнт С. Чырэшкін пабываў у Беларускім тэатры лялек. Там ён зняў удзельнікаў новага спектакля «Лянівае царства» — (злева направа) І. Буко, М. Кулагу, Р. Гардзеева і В. Кушнярэнка, якія абмяркоўвалі сваю прэм'еру.

ВЫПАДКОВАСЦЬ І ПАВЯРХОЎНАСЦЬ

КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ У АБЛАСНЫХ ГАЗЕТАХ

Гаворка пойдзе пра літаратурную рэцэнзію ў абласным друку. Не, гэта, відаць, будзе не зусім дакладна: **толькі пра рэцэнзію.** Вось адзін нумар абласной газеты. Побач з нарысамі аб перадавіках сельскай гаспадаркі і прамысловасці, тэматычна рознымі карэспандэнцыямі, пісьмамі чытачоў, побач з надзённай публіцыстыкай і паведамленнямі з-за мяжы — водгук на новую кнігу пісьменніка. Уверсе — рубрыка «Крытыка і бібліяграфія», якая гаворыць сама за сябе: **значыцца, не толькі рэцэнзія, значыцца — і крытыка, і бібліяграфія.**

Вось яшчэ адзін нумар газеты. Цэлую старонку займаюць вершы і апавяданні маладых літаратараў, тут жа агляд твораў, якія дасланы пачынаючымі ў рэдакцыю, але не трапілі ў друк. Ідзе размова аб тым, як пісаць і пра што пісаць, размова аб літаратурным майстэрстве, пра тое, як звычайны жыццёвы факт, пра які толькі і можна сказаць: так было — набывае раптам новы і глыбокі сэнс. **Значыцца, выхаванне літаратурнай моладзі, выхаванне мастацкага густу.** Што яшчэ? Артыкулы пра класікаў літаратуры, жанравы ці тэматычны агляд мастацкай літаратуры за пэўны час, інфармацыя аб новых кнігах. І ўсё гэта — у абласной газеце.

А цяпер, як гэта ні шкада, давядзецца расчараваць чытача.

Справа ў тым, што газеты, на старонках якой хоць бы на працягу цэлага года можна было сустрэць пералічаныя вышэй матэрыялы (не кажучы пра тое, што яны павінны сістэматычна паўтарацца) — такой газеты, на жаль, пакуль што не існуе. Толькі пасля знаёмства з літаратурнымі матэрыяламі ў шасці нашых абласных газетах можна прыблізна ўявіць сабе, як, у якіх формах і жанрах павінен асвятляць пытанні літаратуры абласны друк. Але тое, што існуе як абагуленае ўражанне ад усіх газет, не існуе ў дачыненні да адной абласной газеты: абласныя выданні ў асвятленні літаратуры яшчэ не знайшлі сябе.

Што ж ёсць на самой справе? Літаратурная крытыка ў абласных выданнях існуе, па сутнасці, толькі ў самой рубрыцы «Крытыка і бібліяграфія», — гэта сарамліва разумеюць і ў рэдакцыях абласных газет, інакш, выставіўшы аднойчы такую рубрыку над звычайнай рэцэнзіяй, не стараліся б пасля ўсяляк заблытваць чытача, паспешліва мяняючы шыльды: «Бібліяграфія», «Прачытайце гэтую кнігу», «Слова чытача» і г. д. Так крытыка застаецца толькі абяцаннем. Ну, а рэцэнзія? Можа, гэта і ёсць той жанр, які найбольш адпавядае абласной газеце і найбольш пад сілу ёй? Са шкадаваннем даводзіцца зазначыць, што і рэцэнзія тут — з'ява рэдкая, што гэта ў пераважнай большасці — анатацыя, дзе-нідзе нязграбна ўпрыгожаная агульнымі фразамі аб майстэрстве, мове, стылі. Кваліфікаванымі, цікавы агляд творчасці пачынаючых знайшлі мы толькі ў «Гродзенскай праўдзе» (аўтар В. Быкаў), зноў жа пашкадаваўшы, што ён адзіны за ўвесь год. Агляды вершаў пачынаючых змяшчае яшчэ брэсцкая «Зара», хоць карысці ад іх маладым паэтам будзе, відаць, небагата. Маецца на ўвазе не якасць артыкулаў, а прынцып разгляду вершаў: «Зара» выкарыстоўвае творчасць маладых паэтаў толькі як матэрыял для публіцыстычнага выступлення. Вылучаюцца для разгляду вершы на надзённыя тэмы, хваляцца добрыя намеры аўтараў, пра якасць жа твораў — ні слова.

Наогул мы не супраць такога выкарыстання дасланых у рэдакцыю твораў. Гаворка пра тэмы, якія хвалююць маладых аўтараў, пра тыя пачуцці, што прымусілі іх узяцца за пяро, мае, несумненна, грамадскую цікавасць. Але ці не заслугоўваюць пачынаючыя літаратары большага? Ці не маюць яны патрэбу ў парадзе кваліфікаванага крытыка, у аб'ектыўнай ацэнцы напісанага імі? Гэта, так сказаць, рытарычнае пытанне, адказ напрошваецца сам сабой.

Можа здацца, што тут прад'яўляюцца залішне высокія патрабаванні да абласных газет. Сапраўды, яны не маюць магчымасці ды, відаць, і не павінны асвятляць пытанні літаратуры гэтак жа шырока, як выданні спецыфічна літаратурныя. Але ж ніхто не стане сцвярджаць, што ў абласным друку не павінен мець месца крытычны артыкул, рэцэнзія на новую кнігу пісьменніка, што эстэтычнае выхаванне працоўных, важнейшым сродкам якога заўсёды была мастацкая літаратура, не справа абласной газеты. Задача яе — прапаганда літаратуры і, заўважым, прапаганда нястомная, мэтанакіраваная, а не павярхоўная папулярызацыя час ад часу выпадковых кніг. Чытач павінен даведацца са старонак сваёй абласной газеты аб самым характэрным і важным у літаратурным жыцці рэспублікі, аб лепшых кнігах, што з'явіліся ў апошні час, аб удзеле пісьменнікаў ва ўсеагульнай барацьбе народа за пабудову камуністычнага грамадства.

Вось чаму вялікае значэнне набывае выбар кніг для рэцэнзавання і тэм для літаратурна-крытычных выступленняў у мясцовым друку. А тут якраз самае слабае месца ў рабоце рэдакцый абласных газет. Што з кніг беларускіх аўтараў, якія з'явіліся ў друку ў гэтым годзе, прапануюцца ўвазе чытача?

«Віцебскі рабочы» за дзевяць месяцаў змясціў толькі дзве рэцэнзіі — на зборнік апавяданняў Ус. Краўчанкі «Зорка Венера» і першую кніжку Д. Бічэль «Дзявочае сэрца». «Мінская праўда» заўважыла толькі кнігі П. Макаля «Вечны агонь», А. Васілевіч «Падслухала сэрца», І. Сіпакова «Сонечны дождж», Ул. Ляпёшкіна «Ранішняя росы»; брэсцкая «Зара» — «Майскую просінь» Г. Бураўкіна; «Гомельская праўда» адгукнулася на першую кнігу маладога празаіка М. Гроднева «За бацькоўскім парогам».

Вылучаюцца літаратурна-крытычныя матэрыялы ў магілёўскай і гродзенскай абласных газетах. Яны больш разнастайныя ў параўнанні з іншымі абласнымі выданнямі. Тут і артыкул А. Макарэвіча аб Т. Шаўчэнку, і выступленне М. Татура, прысвечанае кнігам беларускіх пісьменнікаў, якія павінны выйсці ў гэтым годзе ў Беларгяржвыдавецтве і роздум крытыка Я. Усікава аб ролі літаратуры ў выхаванні чалавека камуністычнай маралі («Магілёўская праўда»). Апошні выступае ў газеце яшчэ двойчы: з рэцэнзіямі на кнігі «Памятныя сустрэчы» М. Хведаровіча і «Лёнька-гром» П. Кавалёва. Літаратуразнаўчую працу С. Александровіча «Старонкі братняй дружбы» разглядае ў адным з нумароў газеты А. Макарэвіч. Аднак і «Магілёўскую праўду» варта папракнуць за не зусім прадуманы выбар кніг для рэцэнзавання. Гаворка ідзе не пра тое, што названыя творы не варта было рэцэнзаваць — нічога благога ў тым, што газета адгукнулася на іх з'яўленне, вядома, няма. Дрэнна тое, што літаратура сёлетняга года аказалася прадстаўленай у газеце аднабакова: прарэцэнзаваны літаратуразнаўчыя і мемуарныя кнігі С. Александровіча і М. Хведаровіча, атрымала ацэнку аповесць П. Кавалёва для дзяцей і выпала з поля зроку газеты многія цікавыя творы іншых беларускіх пісьменнікаў, напісаныя аб сучаснасці, аб Вялікай Айчыннай вайне, творы, якія выйшлі з друку на працягу года асобнымі выданнямі ці з'явіліся ў літаратурных часопісах.

Больш прадумана рэцэнзуе творы беларускай літаратуры «Гродзенская праўда», хоць тут, у адрозненне ад магілёўскай газеты, не знойдзеш ніводнага крытычнага артыкула, так ці інакш прысвечанага пытанням літаратуры. На старонках газеты ацэнены нарыс А. Карпюка «Мая Гродзеншчына», зборнікі Д. Бічэль «Дзявочае сэрца» і Г. Шутэнкі «Мае вочы» (у рэцэнзіі зборнік чамусьці названы «Твае вочы»). Выбар кніг не багаты, але ён апраўданы: аўтары твораў ці нарадзіліся ці жывуць і працуюць на Гродзеншчыне. Рэдакцыю газеты варта папракнуць за тое, што яна абмежавалася толькі гэтымі імёнамі, але наўрад ці трэба папракаць за такі «мясцовы патрыятызм». У дадзеным выпадку прызнаём яго карысным, бо, відаць, таксама дзякуючы яму «Гродзенская праўда» шырока адкрывае дарогу на свае старонкі маладым літаратурным талентам. У гэтым годзе яна ўпершыню пазнаёміла чытачоў газеты з цікавымі вершамі Л. Казачэўскага і А. Булыкі. Пра клопат газеты аб творчым росце і выхаванні літаратурнай моладзі сведчыць і рэдакцыйны артыкул «Раённая газета і маладыя літаратары», надрукаваны ў адным з ліпеньскіх нумароў «Гродзенскай праўды». І пасля гэтага хочацца сказаць: іншым бы газетам хоць трошкі такіх якасцей!

А вось што сур'ёзна засмучае ў абласным друку, дык гэта ўзровень літаратурна-крытычных матэрыялаў. Вядома, ён не заўсёды аднолькава нізкі. Цікавая рэцэнзія Ул. Варно на зборнік Д. Бічэль у «Гродзенскай праўдзе», рэцэнзія А. Кіркевіча на нарыс А. Карпюка там жа. Вылучаюцца рэцэнзіі Я. Усікава і А. Макарэвіча ў «Магілёўскай праўдзе». Але гэтыя матэрыялы не выратоўваюць становішча. Агульны ўзровень літаратурна-крытычных выступленняў абласных газет нізкі.

Скажам шчыра: крытыка і ў рэспубліканскіх нашых выданнях не надта хапае зоры з неба. Паўтарэнне старых ісцін, бязлікіх і гладкіх, як сцёрты пятак, бяздушнае анатамізаванне літаратурнага твора пад нейкую шаманскую тарабаршчыну аб лірычным героі, тэме, дэталі, вобразе, знаходках і стратах, бясконцыя пераказы зместу, фразы, якія сталі для некаторых крытыкаў сакраментальнымі, накшталт: «Увогуле аўтар справіўся са сваёй задачай, але...», «Нягледзячы на асобныя недахопы, твор з'яўляецца пэўным укладам...» — усё гэтыя «класічныя» грымасы дрэннай крытыкі, у тысяча першых адбітках трапіўшы на старонкі абласных газет, не могуць не ўразіць чытача. Вось некаторыя прыклады.

У рэцэнзіі на зборнік М. Гроднева «За бацькоўскім парогам», змешчанай 3 чэрвеня ў «Гомельскай праўдзе», Ул. Якубовіч глыбакадумна піша: «Глыбокая задума аповесці «Чужая віна». Аўтар выбраў нялёгкую, мала кім закранутую тэму (якую — мы так і не даведаемся з рэцэнзіі. — **М. С.**) і, нягледзячы на некаторыя хібы(!), па-мастацку вырашыў яе». Сказана ўсё гэта, відаць, толькі для таго, каб хто-небудзь не падумаў, што ў мастацкім творы тэму дазволена вырашаць не па-мастацку. Гульня ў крытычны аналіз пры дапамозе літаратурных тэрмінаў прыводзіць аўтара ўступнага слова да вершаў Л. Казачэўскага, змешчаных у «Гродзенскай праўдзе» 26 сакавіка, да наступнага заключэння: «Тры надрукаваныя ніжэй вершы—не самае лепшае з паэзіі Казачэўскага, аднак у іх найбольш поўна (?) адлюстравалася самае характэрнае ў яго творчасці» (!). Як магло так здарыцца, вядома, відаць, аднаму толькі аўтару прыведзеных радкоў. Мы ж да гэтага часу чамусьці лічылі, што лепшыя вершы кожнага паэта найбольш поўна выяўляюць і творчае яго аблічча. Ул. Мангіновіч, разглядаючы зборнік апавяданняў Ус. Краўчанкі «Зорка Венера» («Віцебскі рабочы», 5 сакавіка) так хваліць аўтара: «Не могуць не кранаць такія метафары і параўнанні: «Паветра было мякка-аксамітнае», «Рабінай расчырванелася на двары восень» і некаторыя іншыя». А да некаторых іншых аўтар рэцэнзіі, відаць, аднёс бы і фразу «дождж ідзе». Тут, між іншым, таксама метафара. С. Балотны, рэцэнзуючы зборнік П. Макаля «Вечны агонь» («Мінская праўда», 26 сакавіка), строга акрэслівае кола тэм і настрояў, за якія, на яго думку, не павінна выходзіць беларуская літаратура. Ён піша: «Зусім не ўласцівы нашай беларускай літаратуры ні па тэматыцы, ні па гучанню верш «Мільгалі твары»...

Мы прыводзім гэтыя цытаты не дзеля таго, каб прысароміць іх аўтараў, хоць яны, аўтары, безумоўна, павінны адказваць перад чытачом за незвычайную лёгкасць свайго пяра. А хіба не павінны адказваць гэтак жа і тыя, хто блаславіў такія крытычныя практыкаванні ў свет? Чаму, калі ў нарысе або карэспандэнцыі пераблытана прозвішча ці факт, сурова спагнаюць не толькі з аўтара, але і з таго, хто рыхтаваў матэрыял да друку, і чаму ў рэдакцыях абласных газет дапушчальна, каб эмацыянальная і эстэтычная непісьменнасць пры разглядзе літаратурных твораў стала здабыткам чытача? І ўсё гэта замест таго, каб пасапраўднаму дапамагчы пачынаючаму рэцэнзенту, паказаць яму на недахопы, навучыць шанаваць і працу пісьменніка і сваю ўласную працу.

Хочацца спыніцца яшчэ на адным артыкуле, які належыць не пачынаючаму рэцэнзенту, а вучонаму, кандыдату філалагічных навук. Артыкул напісаны да 125-годдзя з дня смерці М. Ю. Лермантава, назва — «Шлях да народа» («Віцебскі рабочы», 26 ліпеня). Аўтар — Ф. Журко. Не спыняючыся на розных сэнсавых недакладнасцях, лагічных няўвязках, якіх багата ў гэтым артыкуле, працытуем толькі два месцы з яго. Пра лермантаўскую драму «Маскарад» ні больш ні менш сказана наступнае: «У п'есе «Маскарад» (1835) сатырычна выкрываецца «цвет арыстакратыі», картачныя шулеры, цёмныя прайдзісветы, кар'ерысты, інтрыганы». І... кропка. Увесь сэнс твора пра драму Арбеніна, «странного человека», як бачыце, зводзіцца да выкрыцця картачных шулераў і г. д. А вось характарыстыка «Героя нашага часу»: «Лермантаў першым стварыў сацыяльна-псіхалагічны раман, у якім паказваецца трагедыя маральнага калекі. Паэт (?) прыходзіць да высновы, што мяцеж адзіночкі калечыць, надламвае характар, усяляе расчараванне». І аказваецца, што ў сацыяльна-псіхалагічным рамане няма ніякага сацыяльнага сэнсу, увесь яго змест пераводзіцца Ф. Журко ў нейкі хісткі маральны план. І ўсё гэта напісана больш як праз сто год пасля артыкула Бялінскага пра «Героя нашага часу», пасля школьных падручнікаў, дзе, нам думаецца, усё ж такі сказана праўда пра вялікі раман Лермантава. Ды ці чытаў, нарэшце, вучоны, кандыдат філалагічных навук, гэты твор?

Некалькі слоў пра спрошчаны, груба утылітарны падыход да з'яў літаратуры. Між іншым, гэта хвароба не толькі літаратурна-крытычных матэрыялаў у абласным друку. І ў рэспубліканскіх выданнях трапляюцца артыкулы, якія, здаецца, спецыяльна напісаны для тых чытачоў, якія найвялікшым пісьменнікам лічаць Дзюма, якія і на літаратурных канферэнцыях і ў друку заўжды вінавацяць пісьменнікаў за тое, што яны, маўляў, не прысвяцілі сваіх твораў рабоце адраснага бюро, загса і г. д. На літаратуру яны глядзяць то як на займальны дэтэктыў, то як на рэгістрацыйную кнігу, то як на метадычны дапаможнік па нейкай прафесіі ці галіне ведаў.

А горш за ўсё, што знаходзяцца рэцэнзенты, якія гатовы патураць такім чытачам. І дрэнна, што рэцэнзіі, напісаныя гэтымі аўтарамі, часам друкуюць перыядычныя выданні.

Ц. Кажамякін, рэцэнзуючы ў «Гомельскай праўдзе» аповесць «Грэшніца» М. Еўдакімава (26 мая), назву якой ён чамусьці лічыць драматычнай, шкадуе, што аўтар не паведаміў, ці была ў вёсцы, дзе жыла гераіня твора, камсамольская арганізацыя. Даводзіцца даваць тлумачэнні за аўтара: камсамольская арганізацыя ўсё ж, відаць, была. Л. Гуцаленка, пішучы ў «Гродзенскай праўдзе» пра раман Л. Абухавай «Заноза», сцвярджае, што нібыта пісьменніца ў новым творы, як і ў аповесці «Глыбінь-гарадок», «паказвае кіраўніцтва сельгасарцелямі з боку райкома ў поўным адрыве ад пярвічных партыйных арганізацый калгасаў». Нібыта Л. Абухава пісала не раман, а справаздачны даклад аб рабоце райкома партыі. Прыклады і цытаты можна прадоўжыць.

І цяпер вернемся да самага галоўнага. Якой жа павінна быць літаратурная крытыка і бібліяграфія ў абласной газеце? Было сказана ўжо, што крытыкі ў абласных выданнях няма. Гэта праўда. Але ці не трэба клапаціцца, каб крытыка — сапраўдная, баявая, дасціпная крытыка прыйшла, нарэшце, на старонкі абласнога друку? Што для гэтага трэба? Патрэбны людзі, якія добра валодаюць пяром і хочуць валодаць ім яшчэ лепш. Людзі, якія любяць і разумеюць літаратуру і жадаюць гэтае разуменне перадаць другім... Тут мы вымушаны спыніцца, бо нам чуецца ўжо зычны ў сваёй паспешлівай пераможнасці голас работнікаў абласных газет: «Дайце нам такіх людзей — і мы дадзім вам крытыку». Маўляў, не хапае толькі апоры, як таму архімедаву рычагу.

Ну, што ж... Няхай сабе апора. Яна — тыя самыя людзі, якіх кожнаму рэдактару было б прыемна залічыць у аўтарскі актыў. Яны ёсць і ў Брэсце, і ў Гродна, і ў Магілёве, і ў Віцебску. У Магілёве працуе аддзяленне Саюза пісьменнікаў БССР. Тут жывуць два прафесіянальныя крытыкі — Я. Усікаў і А. Макарэвіч. У тым жа Магілёве яшчэ некалькі літаратараў, членаў пісьменніцкай арганізацыі. У Брэсце жыве крытык Ул. Калеснік, жывуць пісьменнікі і ў іншых абласцях. А выкладчыкі педагагічных інстытутаў, студэнты-філолагі, маладыя літаратары, нарэшце, самі рэдакцыйныя работнікі? Гэта той аўтарскі актыў, з дапамогаю якога можна значна палепшыць у абласных газетах асвятленне пытанняў літаратуры. Трэба толькі смялей прыцягваць яго да ўдзелу ў газеце, патрабавальна ставіцца да літаратурна-крытычных матэрыялаў, якія паступаюць у газету.

Высокакваліфікаваная крытыка і бібліяграфія павінны з'явіцца ў абласным друку. Слова за рэдакцыямі абласных газет.

М. СТРАЛЬЦОЎ.

МАЙСТРЫ МАСТАЦКІХ ВЫРАБАЎ

У Мінску на Цнянскай вуліцы стаіць прыгожы, вялізны, трохпавярховы будынак.

Тут знаходзіцца фабрыка мастацкіх вырабаў Галоўнага ўпраўлення мясцовай прамысловасці пры Савеце Міністраў БССР.

Да 100 назваў розных прадметаў шырокага спажывання выпускае фабрыка. Гэта разнастайны асартымент адзення, абрусы, сурвэткі, падарункавыя вырабы і інш. Усе яны ўпрыгожаны мастацкай вышыўкай. Асаблівую цікавасць выклікаюць парцьеры, зробленыя па матывах слуцкіх паясоў. Нядаўна фабрыка выканала заказ для Дзяржаўнага ансамбля танца БССР. Артысты атрымалі па-майстэрску зробленыя беларускія нацыянальныя гарнітуры.

Дастойную сустрэчу рыхтуе калектыў прадпрыемства XXII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Стаўшы на працоўную вахту, рабочыя ўзялі абавязацельствы выканаць да адкрыцця з'езда план 10 месяцаў, даць звышпланавай прадукцыі на 67 тысяч рублёў.

Побач з ветэранамі прадпрыемства Е. Мальцавай, З. Сафонавай, В. Урбан працуе здольная моладзь. Сотні маладых работніц прыйшлі сюды пасля заканчэння 10 класаў. Сярод іх Фаіна Бацяйкіна — студэнтка-завочніца Мінскага педінстытута, Яніна Скуратовіч, якая вучыцца ў тэхнікуме лёгкай прамысловасці, Ірына Жук, Антаніна Талкачова і інш. Усе яны ўзялі абавязацельствы выпускаць прадукцыю толькі выдатнай якасці, павышаць прадукцыйнасць працы, актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці.

Першай на фабрыцы ўдастоілася гонару рапартаваць з'езду партыі змена пашыву № 1 (майстар змены Т. Расказава). Яна датэрмінова выканала 10 месячны план на 106 працэнтаў.

На здымку — Вікторыя Антонаўна звыш 20 год, вельмі задаволена работай свайго маладога брыгадзіра Ірыны Жук.

Урбан, якая працуе на фабрыцы ў ліку лепшых.

ДОБРАЕ ПАЧЫНАННЕ

Адкрыўся універсітэт культуры пры домакіраўніцтве № 1 у Мінску з двухгадовай праграмай па музыцы, тэатру і кіно. Адбыўся арганізацыйны сход слухачоў універсітэта.

Пра задачы універсітэта і змест яго праграмы паведаміў музыказнаўца І. Нісневіч і народная артыстка БССР Г. Абуховіч.

Перад слухачамі універсітэта выступілі з шэфскім канцэртам артысткі Л. Ражанава, Т. Шымко, Л. Весніна, І. Вішнеўская, Я. Палосін, В. Міронаў, Ю. Матраеў, Ю. Дзяргун, М. Пушкароў, Ю. Смірноў, канцэртмайстар Т. Міянсарава, скрыпач А. Валошын.

У САДРУЖНАСЦІ З КАМПАЗІТАРАМІ

Пра стварэнне сучаснага беларускага рэпертуару для Народнага аркестра ўжо не раз пісалася. І гэта не выпадкова. Творчае аблічча і далейшае развіццё такога спецыфічнага калектыву, як Дзяржаўны народны аркестр БССР, у многім залежыць ад таго, якое месца ў яго рэпертуары зоймуць творы аб нашай гераічнай рэчаіснасці.

За апошні час члены мастацкага савета Народнага аркестра знаёміліся з цэлым радам новых арыгінальных твораў. Аўтары гэтых твораў — не толькі вопытныя беларускія майстры, якія ўжо не раз прабавалі свае сілы ў жанры народнай інструментальнай музыкі, але і тыя, хто ўпершыню паспрабаваў пісаць для цымбал, ліры, дудак і г. д.

Харавыя і вакальныя творы І. Кузняцова папулярныя ў народзе. Цяпер кампазітар напісаў першы твор для народнага аркестра. Партытура Кузняцова грунтуецца на народна-песенных інтанацыях.

Ю. Семяняка пазнаёміў нас нядаўна з клавірам свайго першага твора для народнага аркестра. Гэты твор меладычны. Процістаўленая дынамічнай галоўнай партыі лірычная побочная тэма (твор напісан у санатнай форме) — прывабная і задушэўная.

У канцы гэтага года адбудзецца агляд творчасці маладых кампазітараў рэспублікі. Таму хочацца больш падрабязна спыніцца на творах маладых аўтараў. Творы іх ужо гучалі ў нашых канцэртах. Гаворка ідзе пра «Беларускую маладзёжную рапсодыю» І. Ронькіна.

У мінулым сезоне Народны аркестр выканаў першы твор І. Ронькіна для народных інструментаў — Канцэрт для двух цымбал з аркестрам. Гэты Канцэрт, добра прыняты публікай у многіх гарадах, дзе гастраляваў наш калектыў, паслужыў стымулам для далейшай працы маладога кампазітара над музыкай для Народнага аркестра. Хоць у партытуры рапсодыі адчуваецца недасканаласць інструментоўкі, тым не менш можна сказаць, што І. Ронькін авалодаў тэхнікай пісьма для народнага аркестра, нядрэнна адчувае магчымасці асобных інструментаў і ўсяго ансамбля ў цэлым. Удала выкарыстаны саліруючыя інструменты, партыі якіх напісаны з густам.

Творчы шлях Д. Смольскага толькі пачынаецца. Прыемна адзначыць, што малады кампазітар адразу ўзяўся за твор вялікай формы для народных інструментаў — Канцэрт для цымбал з аркестрам.

Ужо на першым праслухоўванні спадабаліся тэмперамент, сучаснасць меладычнай і гарманічнай мовы гэтага твора, добрае адчуванне формы. Твор радуе свежасцю мелодыі. Аўтар умее спрошчанасці трактоўкі. Такі падыход да стварэння музыкі для народнага аркестра найбольш правільны. Часам можа здацца, што новы канцэрт не вельмі «цымбальны», тым не менш яго жыццярадаснасць, мяккасць пабочнай тэмы, якая нагадвае добрыя ўзоры дзявочай лірычнай песні, робіць твор вельмі прывабным. Не выпадкова з захапленнем працуе над Канцэртам лаўрэат VI Сусветнага фестывалю ў Маскве В. Бурковіч — першы выканаўца новага твора.

З'явіліся ў нашым рэпертуары і новыя песні. Сярод іх «Пакаленне» Ул. Алоўнікава, «Жыцьі» Я. Глебава. Яшчэ нядаўна мы наракалі на «рэпертуарны голад», але цяпер, калі гэты «голад» пачаў паступова знікаць, хочацца, каб не засталіся толькі на словах выказаныя многімі кампазітарамі абяцанні пісаць музыку для нас. Пажадана, каб І. Кузняцоў і Ю. Семяняка стварылі першыя кантаты, а Я. Глебаў напісаў першую сімфонію для Народнага аркестра, каб Д. Смольскі ажыццявіў напісанне паэмы, а Г. Вагнер завяршыў даўно пачатую працу над «Беларускай рапсодыяй».

Патрэбны нам таксама добрыя песні, асабліва апрацоўкі народных мелодый і песні пра сучаснасць.

В. БАРСАЎ,
дырыжор Дзяржаўнага народнага аркестра БССР.

На здымку малады кампазітар Д. Смольскі (справа) знаёміць лаўрэата VI Сусветнага фестывалю моладзі ў Маскве цымбаліста В. Вурковіча са сваім новым Канцэртам для цымбал з аркестрам.

Фота Ул. Крука.

Сярод кніг

Шчырая размова

Іван Бурсаў піша цёпла, шчыра, усхвалявана. Жывая непасрэднасць і тонкая назіральнасць — вось тое галоўнае, што вылучае амаль усе вершы новага зборніка маладога паэта «Едзе лес», адрасаванага дзецям.

— Прыгледзьцеся, азірніцеся ўважліва вакол сябе — і вы ўбачыце многа-многа надзвычай прыгожага і цікавага,— нібы гаворыць паэт маленькім чытачам.

Вось як светла, проста і паказачнаму прыгожа піша паэт пра сняжынкі:

Легкие, крылатые.
Как ночные бабочки,
Кружатся,
Кружатся
Над столбом у лампочки.
Собрались на огонек.
А куда им деться?
Им ведь тоже, ледяным,
Хочется погреться.

Гэтае яркае адухаўленне прыроды — ад бязмежнай любві да яе, ад шчырага захаплення жыццём. Чытаючы простыя, шчырыя вершы паэта, маленькія чытачы міжволі адчуюць, што пісаў іх чалавек, які многа і добра бачыць наўкол і ўмее перадаць убачанае іншым.

Тонка і дакладна, трапна і дасціпна намаляваў паэт зайца-гультая, які будаваў, будаваў сабе хату ды...

Уморился.
Сделать крышу поленился.
А вокруг —
Белым-бело.
Куст дрожит от стужи...
Зайцу в домике тепло.
Мерзнут только...
Уши.

Такія маляўнічыя і ёмкія мініяцюры выклікаюць багатыя, яркія асацыяцыі.

Паэт умее дакладна адрасаваць сваё слова. Ён па-майстэрску валодае вайздросным уменнем гаварыць проста, шчыра і ў той жа час — з глыбокім унутраным хваляваннем, якое абавязкова перадаецца чытачу. Паэт ніколі не выступае халодным назіральнікам і канстататарам фактаў.

Думаецца, што калі б аўтар проста расказаў аб гібелі шпака, дакладна зафіксіраваў усе дзеянні і ўчынкі герояў верша — усё роўна атрымалася б штосьці няпэўнае, празаічнае, урэзнае банальнае, многа разоў дзесьці чутае і паўторанае. Але калі паэт загаварыў пра тое, як

Он спешил
Летел домой
Над водой и сушей
В прошлогодний домик свой
На родную грушу.
Он спешил сюда.
Назад.
Где ольха в сережках.
Он летел в знакомый сад.
Где живет Сережка...—

маленькі чытач міжволі адчуе замілаванне да гэтай маленькай птушачкі, якая ні мінуты не хоча заставацца на чужыне, спяшаецца ў свой родны куточак. І якім жа болем сціснецца сэрца, калі ёк даведаецца пра тое, чаго не мог ведаць шпак:

Он совсем не знал того,
Что мальчишка гадкий
Приготовил для него
Страшную рогатку.

І як цяжкім дакорам маленькаму злачынцу гучаць заключныя радкі верша:

А ведь так спешил скворец
К этому Сережке.

І. Бурсаў умее не толькі перадаваць малюнкі прыроды, але дае чытачу адчуць і зразумець, што ўсё гэта не вельмі ўжо і мудра, складана, а, наадварот, даступна кожнаму, хто шчыра палюбіць яе, прыслухаецца да яе галасоў. Пра гэта яскрава сведчыць цікавы, памайстэрску зроблены верш «Як я яршоў лавіў». Паэт нібы сапраўды падслухаў размову чароту:

Мне шепнули камыши:
«Ши-ши-ши...
В этом омуте ерши
Хо-ро-ши»

Кожны радок тут адточаны, дакладны, ёмкі.

Надзвычай яркую паэтычную карціну нараджэння новага дня стварыў паэт у вершы «Дзень прыйшоў».

Чытаючы кнігу, амаль увесь час адчуваеш, што І. Бурсаў умее патрабавальна ставіцца да сябе ў творчасці. Таму ўзнікае засмучэнне, калі трапляеш на шэрыя, малавыразныя, дэкларатыўныя вершы. Здаецца напісаны яны калі не механічна («Верабей», «Жнівень»), дык ва ўсякім выпадку без натхнення («Едзе лес», «Заўтра ў школу»).

Невялічкая паэма, што заключае кніжку — цудоўная песня аб надыходзе вясны. Напісана яна добрым, моцным вершам, радкі якога гучаць тонка і меладычна.

Тут і гоман зледзянелых дрэў («Зазвенели тут березы: — Надоели нам морозы!»), і паэтычны малюнак шумнага веснавога лесу. І плач дрэў ад радасці надыходу вясны.

Сапраўднай паэзіяй вее на чытача пры знаёмстве з новай кніжкай маладога паэта.

І. ПАЎЛЮКОЎСКІ.

І. Бурсаў. «Едет лес». Беларгяржвыдавецтва. Мінск, 1961.

БЕЗ ДЫДАКТЫКІ

Першая кніжка Валерыя Высоцкага «Друзья-приятели» напісана аб дзецях. Аўтар вядзе апавяданне жыва, з гумарам. Сюжэт твора — «сапраўдныя гісторыі з жыцця пяцікласніка Пецькі Мухіна і яго сяброў».

Аўтару ўдалося стварыць жывы, запамінальны характар. Пецька—адзін з тых, над якімі «б'юцца» ў школе, выхоўваюць, «прабіраюць» і якія, урэшце рэшт, вырастаюць добрымі людзьмі: едуць, не задумваючыся, на цалінныя землі, ідуць з пошукавай экспедыцыяй у тайгу.

У лепшых апавяданнях зборніка няма надакучлівай дыдактыкі, аўтар даносіць да чытача сваю думку праз псіхалагічна абгрунтаваныя сюжэт і паводзіны герояў.

Вось раздзел «Алень у зарасніках». «Заядлы» чытач Генка прыходзіць да «заядлага» чытача Пецькі Мухіна, і абодва пачынаюць успамінаць, хто колькі кніг прачытаў за месяц. На самай справе хлапчукі вельмі нядбайныя чытачы. Пецька выхваляецца, што ў кніжцы са школьнай бібліятэкі «матросам вусы падмаляваў»; Генка па сакрэту прызнаецца: у адной кніжцы вырваў цэлы ліст. Абодва смяюцца, абодвум весела. Але калі Генка вяртае Пецьку яго ўласную кніжку, таму робіцца не да смеху: уся яна заплямленая, растрыбушаная. І Пецька нечакана абураецца.

Дынамічна развіваецца дзеянне апавядання «У трамваі». Радуе ў ім дакладная псіхалагічнасць. Пецька, як заўсёды, едзе на трамваі без білета. У вагоне ён заўважае, што нейкі незнаёмы аднагодак пільна за ім сочыць. Не вытрымлівае Мухін, хутчэй купляе білет: а што, калі хлопчык—грамадскі кантралёр? Горка Мухіну, і ён са злосцю пазірае на непрыемнага суседа. А той нечакана сарваўшыся з месца, таксама спяшаецца да кандуктара...

Ніякага рэзюме не прапануе аўтар у гэтай вясёлай, дасціпнай сцэнцы. Але зразумела, што Мухін і тут задумаецца, задумаецца не на хвілінку. Так самая звычайная гісторыя становіцца падзеяй Пецькавага жыцця, павучальнай у самым добрым сэнсе гэтага слова.

Там, дзе аўтар займальна і ўдумліва апавядае пра Пецьку («Паездка ў Русанаўку», «Санітар», «Аматар клубнікі»), мы выразна бачым і ўяўляем гэтага хлопчыка — гарэзлівага і непаседнівага. Але калі-нікалі аўтар фальшывіць, і тады хлопчык нечакана кідае зусім не ўласцівыя яму «дарослыя» словы: «...учти... штрейкбрехер!..»

Дарэчы сказаць, на неўласцівую ім «дарослую» мову часта збіваюцца і іншыя персанажы кнігі В. Высоцкага. Вобразы аднагодкаў Мухіна амаль не ўдаліся яму. Гэта хлопчыкі і дзяўчынкі, якія рознядца, бадай што, толькі імёнамі. І яшчэ горш з вобразамі дарослых. Нельга ж прымушаць прыбіральшчыцу цётку Машу разважаць так ненатуральна: «Не обессудьте меня, старуху, а не буду греха таить—есть и такие, что не уважают труда нашего. Да... Вот и в вашем классе знаю одного такого жильца моего».

Пецька Мухін — скразны вобраз кнігі. І ўсё ж В. Высоцкі не рашыўся назваць кнігу аповесцю. Ён, відаць, сам адчувае кампазіцыйную раскіданасць, сюжэтную неарганізаванасць многіх сцэнак. Кнізе дадзены падзагаловак — «сапраўдныя гісторыі з жыцця Пецькі Мухіна і яго сяброў». Многія апавяданні ў цыкле не нясуць сур'ёзнай думкі. Гэта проста гісторыі дзеля гісторый, анекдатычныя выпадкі.

Што хацеў сказаць аўтар апавяданнем «Стрэл на арыфметыцы»? Толькі тое, што Пецька стрэліў з рагаткі ў вуха Воўкі Сахнюка. Тут яўна не хапае заканчанасці нейкага маленькага штрышка, павароту думкі, ад якога апавяданне зажыло б новым, асэнсаваным жыццём.

Гэтага ж нестае і некаторым іншым апавяданням («Талент», «Гузік», «Сеанс»).

В. Высоцкі піша займальна і дасціпна, гаворыць з дзецьмі, як з роўнымі. У гэтым—вартасць яго першай кніжкі.

Эд. КАРПАЧОЎ.

ПРА НАШАГА ПАМОЧНІКА І ДАРАДЧЫКА

«Савецкая літаратура і мастацтва, — гаворыцца ў праекце новай Праграмы КПСС, — прасякнутыя аптымізмам і жыццясцвярджальнымі камуністычнымі ідэямі, адыгрываюць вялікую ідэйна-выхаваўчую ролю, развіваюць у савецкім чалавеку якасці будаўніка новага свету. Яны закліканы служыць крыніцай радасці і натхнення для мільёнаў людзей, выражаць іх волю, пачуцці і думкі, служыць сродкам іх ідэйнага ўзбагачэння і маральнага выхавання».

Кнігі беларускіх пісьменнікаў атрымалі шырокую папулярнасць за межамі рэспублікі. Ў цэнтры увагі твораў беларускай літаратуры — просты, сціплы, працавіты чалавек з яго багатым унутраным светам, імкненнем да светлай будучыні — камунізма.

Да дня адкрыцця гістарычнага XXII з'езда партыі калектывы выдавецтваў і паліграфічных прадпрыемстваў рэспублікі завяршаюць выпуск 135 назваў кніг і плакатаў тыражом звыш мільёна экземпляраў. Гэтая літаратура прапагандуе марксісцка-ленінскую тэорыю, практыку камуністычнага будаўніцтва, барацьбу беларускага народа за датэрміновае выкананне сямігадовага плана.

Даць чытачу кнігу змястоўную, добра мастацкі аформленую і паліграфічна выкананую — ганаровая задача кнігавыдавецкіх работнікаў рэспублікі.

Паляпшаючы якасць зместу, рэдактары выдавецтваў часцей прыцягваюць у якасці аўтараў — наватараў і перадавікоў вытворчасці, якія дзеляцца сваім вопытам работы, расказваюць пра новыя, больш эфектыўныя метады працы, заклікаюць да новых рубяжоў па датэрміноваму выкананню сямігадовага плана.

У цэнтры ўвагі калектываў кніжных выдавецтваў — выпуск твораў Ул. І. Леніна, дакументаў па гісторыі КПСС і КПБ, перадз'ездаўскай літаратуры, якая адлюстроўвае барацьбу працоўных за пабудову камуністычнага грамадства.

Аператыўна былі выпушчаны праекты новай Праграмы і Статута КПСС, творы Ул. І. Леніна «Пытанні будаўніцтва сацыялізма і камунізма ў СССР», «Аб камуністычным выхаванні» і рад работ беларускіх аўтараў. Сярод іх кнігі І. Лушчыцкага «Савецкая дзяржава ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма», М. Саламахі «Працаваць і жыць па-камуністычнаму», М. Лабаценкі «Міжнародны камуністычны і рабочы рух на сучасным этапе» і інш.

Творчай актыўнасці будаўнікоў камунізма, высокім маральным якасцям савецкага чалавека, нецярпімасці да буржуазнай ідэалогіі і маралі, дружбе народаў, інтэрнацыяналізму, барацьбе беларускага народа за захаванне і ўмацаванне міру прысвечаны творы беларускіх вучоных, пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў.

Дзяржаўнае выдавецтва БССР аказала вялікую практычную дапамогу, выпусціўшы дзве серыі лекцый для кіраўнікоў і слухачоў пачатковых эканамічных школ і гурткоў на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, а таксама серыі навукова-папулярных лекцый па важнейшых пытаннях сельскай гаспадаркі.

Вялікую цікавасць праяўляе грамадскасць да вытворчай літаратуры, аўтарамі якой з'яўляюцца перадавыя рабочыя, тэхнікі, інжынеры, якія дзеляцца сваім вопытам па павышэнню прадукцыйнасці працы, удасканаленню вытворчасці.

Пра каштоўны пачын стругальшчыкаў Мінскага завода аўтаматычных ліній расказвае стругальшчык завода Л. Патаповіч у брашуры «Навучыўся сам — навучы другога». Аб рабоце прадпрыемства камуністычнай працы расказвае дырэктар Віцебскага дывановага камбіната Д. Пятроў у брашуры «Працуем па-камуністычнаму».

На прадпрыемстве, гаворыць аўтар, няма ніводнага чалавека, хто не выконваў бы зменнага задання, хто б не вучыўся, не ўдасканальваў сваіх ведаў, не выпускаў прадукцыю толькі першага гатунку.

Пра сапраўдных энтузіястаў камуністычнай працы, наватараў, рацыяналізатараў — машыніста А. Шабуняева, шкловара Е. Шчытава, брыгадзіра будаўнічай брыгады канчатковай прадукцыі УНР-43 М. Сівухіна расказвае І. Палякоў у брашуры «На аснове творчасці мас». З вялікай цікавасцю прачытае чытач брашуру М. Кіндзерскага «У барацьбе за павышэнне рэнтабельнасці гаспадаркі».

Высокую ацэнку будаўнікоў атрымала брашура Героя Сацыялістычнай Працы, брыгадзіра муляраў Д. Булахава «Будуем горад». У ёй расказваецца пра арганізацыю, вядзенне цагляных і мантажных работ на важнейшых стадыях будаўніцтва, пра расстаноўку людзей, пра выхаванне і навучанне маладых рабочых.

Цяпер, калі кніга стала духоўнай патрэбаю кожнай сям'і, усё больш узрастае цікавасць да мастацкай літаратуры. І нашы выдавецтвы штогод павялічваюць выпуск мастацкай і асабліва юнацкадзіцячай літаратуры. Напрыклад, калі ў 1960 годзе было выпушчана 175 назваў кніг, тыражом тры мільёны экземпляраў, дык сёлета будзе выдадзена 218 назваў тыражом звыш чатырох мільёнаў экземпляраў.

У асноўным гэта новыя арыгінальныя творы беларускіх пісьменнікаў. Дзяржаўнае выдавецтва БССР сёлета парадуе чытачоў «Анталогіяй беларускай паэзіі» ў трох тамах; выйдуць у свет тры першыя тамы поўнага Збору твораў класіка беларускай літаратуры Я. Коласа. Выданне Збору твораў Я. Купалы ў шасці тамах ажыццяўляе выдавецтва Акадэміі навук БССР. У бягучым годзе выходзяць два першыя тамы.

Працоўныя рэспублікі, ажыццяўляючы велічныя планы сямігодкі, бяруць на ўзбраенне кнігу — крыніцу ведаў. І кніг становіцца ў нашых магазінах усё больш, яны значна лепш выдаюцца цяпер. Паліграфічныя прадпрыемствы рэспублікі забяспечаны навейшым айчынным абсталяваннем. Яны могуць выпускаць за суткі звыш ста тысяч кніг.

Пра небывалы рост выпуску кніг і плакатаў у рэспубліцы гавораць наступныя лічбы. У 1960 годзе было выдадзена 1 602 назвы брашур і кніг, тыражом 14,2 мільёна экземпляраў. У параўнанні з 1956 годам іх выпуск вырас у два разы.

За гады Савецкай улады ў Беларусі выдадзена 27 425 назваў кніг тыражом звыш 324 мільёны экземпляраў.

Ажыццяўляючы перспектыўны план развіцця, удасканальваючы метады працы, укараняючы новае, перадавое ў кнігавыдавецкай справе пры наяўнасці выдатнага паліграфічнага абсталявання, выпуск кніжнай прадукцыі ў рэспубліцы ўзрасце ў 1970 г. да 37 мільёнаў экземпляраў, а ў 1980 г. — 66 мільёнаў экземпляраў. За бліжэйшыя дваццаць год выпуск кніг і брашур у Беларусі павялічыцца больш чым у чатыры разы!

Павялічыцца колькасць кніг на душу насельніцтва. Так, калі ў мінулым годзе на аднаго чалавека прыпадала дзве кніжкі, дык у 1970 годзе будзе — чатыры, а ў 1980 годзе ўзрасце да шасці кніг.

Наша партыя ў сваім праекце новай Праграмы запэўняе, што яна і надалей «будзе нястомна клапаціцца аб росквіце літаратуры, мастацтва, культуры, аб стварэнні ўсіх умоў для найбольш поўнага праяўлення асабістых здольнасцей кожнага чалавека, аб эстэтычным выхаванні ўсіх працоўных, фарміраванні ў народзе высокіх мастацкіх густаў і культурных навыкаў».

У выкананні гэтай пачэснай задачы вялікая роля належыць кнізе, выпуск якой будзе ў нас павялічвацца з кожным годам.

А. ВАСІЛЕЎСКІ,
старшы кантрольны рэдактар Галоўыдата Міністэрства культуры БССР.

ГІСТОРЫЯ АДНОЙ КАРЦІНЫ

Карціна В. Верашчагіна «Асада Троіца-Сергіева манастыра», якая экспануецца ў адной з залаў Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, выстаўлена тут параўнальна нядаўна. У свой час, калі гэтае палатно знаходзілася ў Слонімскім краязнаўчым музеі, яно памылкова было прыпісана другому аўтару, а іменна батальісту А. Верашчагіну.

Даследаванні дазволілі ўстанавіць, што карціна напісана В. Верашчагіным у 90-х гадах мінулага стагоддзя. Яна ўяўляе сабою адзін з варыянтаў арыгінала, які захоўваецца ў Дзяржаўным рускім музеі ў Ленінградзе.

Такім чынам, наш музей захоўвае рэдкі твор рускага мастака, які мае цікавасць для савецкага мастацтвазнаўства.

Імя Васіля Пятровіча Верашчагіна мала вядома шырокай публіцы. Ён нарадзіўся ў Пермі ў 1835 г. Першапачатковую адукацыю атрымаў у іконапісца. З 1869 г. Верашчагін — прафесар гістарычнага і партрэтнага жывапісу. Значнае месца ў творчасці мастака займалі сюжэты на былінныя і міфалагічныя тэмы. «Асада Троіца-Сергіева манастыра» з'яўляецца па сутнасці адным з першых палотнаў, у якім мастак звярнуўся да гістарычных падзей з гераічнага мінулага Расіі.

...Цяжкія для Расіі гады. Скарыстаўшы ўнутраныя супярэчнасці, якія раздзіралі Расію, гаспадарчы заняпад, выкліканы апрычнінай і шматгадовай лівонскай вайной, польска-літоўскія інтэрвенты ў 1604 г. утаргаюцца ў межы Маскоўскай дзяржавы.

Адзін з эпізодаў вайны і ляг у аснову карціны В. Верашчагіна. Гэта гераічная шаснаццацімесячная абарона Троіца-Сергіевай лаўры (манастыра). Сюжэтам для карціны выбран момант публічнай прысягі абаронцаў, якія клянуцца стаяць да канца і не дапусціць ворага ў крэпасць.

Нягледзячы на тое, што час накладаў свой адбітак і некалькі аслабла ранейшае гучанне фарбаў, успрыняцію ідэйнага зместу карціны садзейнічае яе багаты налярыт, вытрыманы ў сурова-напружаных танах, сям-там падсвечаных цёплымі блікамі.

Такая характарыстыка гэтага ўнікальнага твора, які несумненна, будзе цікавы для наведвальнікаў.

Калі і якім чынам трапіла гэта карціна ў межы Беларусі? Мы прасілі б тых, каму вядомы ў нейкай меры лёс гэтага твора, напісаць у адрас музея.

В. БАЛДАЕУ.

Гродна.

ВАРШАВА Ў ФОТАЗДЫМКАХ



У памяшканні Мінскага цырка наладжана выстаўка мастацкай фатаграфіі «Варшава», прысвечаная сталіцы Польскай Народнай Рэспублікі.

Выстаўка арганізавана Саюзам польскіх журналістаў па прапанове Саюза журналістаў СССР да XVI гадавіны вызвалення Варшавы Савецкай Арміяй і Войскам Польскім.

Тут экспануюцца фатаграфіі, якія на працягу 1945—1960 гадоў друкаваліся ў Варшаўскім ілюстраваным штотыднёвіку «Сталіца».

Аўтарам здымкаў з'яўляецца фотарэпарцёр Збышка Сямашка.

Песні, якія спявалі партызаны

Мужнае паэтычнае слова партызан, народжанае на прывалах і ў кароткія мінуты зацішша паміж баямі,—вось змест зборніка «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны». Гэтую кнігу, падрыхтаваную Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, выпусціла выдавецтва Акадэміі навук БССР.

За апошнія некалькі год навуковыя работнікі сабралі і класіфікавалі некалькі тысяч твораў народных мсціўцаў—песень, вершаў, частушак, казак, маршаў, прыказак, прымавак, паданняў, легенд, узораў сатыры і гумару. Вучоныя адабралі для кнігі ўсё найбольш каштоўнае, што стварыў народ у дні цяжкай барацьбы з фашызмам. У зборніку выкарыстаны матэрыялы навуковых экспедыцый, запісы песень, зробленыя партызанамі і збіральнікамі фальклору. Нямала цікавага было знойдзена ў падпольных і партызанскіх газетах, рукапісных і машынапісных зборніках, альманахах, дзённіках, запісных кніжках і іншых дакументах ваенных год, якія захаваліся. Былі шырока выкарыстаны багатыя фонды народнай творчасці, якія захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, партыйным архіве пры ЦК КПБ, краязнаўчых музеях, дамах народнай творчасці і абласных архівах.

Народная паэзія, што ўвайшла ў зборнік,—своеасаблівы гісторычны дакумент эпохі, які адлюстроўвае пачуцці, волю, думкі савецкіх людзей, што змагаліся ў радах народных мсціўцаў. Цэнтральнымі героямі фальклорных твораў з'яўляюцца воіны Савецкай Арміі і партызаны. У яркіх вобразах адлюстраваны важнейшыя ваенныя, палітычныя і міжнародныя падзеі. Асабліва поўна і ўсебакова паказаны формы і метады партызанскай барацьбы—разгром фашысцкіх гарнізонаў, штабаў, аэрадромаў, рэйкавая вайна.

Вершы, якія ўвайшлі ў адзін з раздзелаў, рысуюць карціну становішча савецкіх людзей у фашысцкай няволі, іх незгінальную мужнасць. З хваляваннем чытаюцца лірычныя вершы. Песні «Над Бярозай-ракой, над далінай», «То не хмары навіслі над краем», «Падрыўнікі ідуць сцежкай», «Пад сцягам Леніна», «Іх было трынаццаць» і многія іншыя якія спяваліся ў партызанскіх атрадах і партызанскіх зонах, напоўнены бадзёрасцю і адвагай, у іх гучыць заклік да барацьбы і вера ў перамогу над ворагам.

Некаторыя песні прысвечаны Канстанціну Заслонаву, Ціхану Бумажкову. У зборнік увайшлі таксама песні пра Адэсу, Севастопаль, Ленінград, Сталінград, вершы аб мужнасці абаронцаў Брэсцкай крэпасці, герояў славутага Лаўскага бою, герояў бою за Краснае.

ПАКАЗ КІТАЙСКІХ ФІЛЬМАЎ

1-га кастрычніка адзначалася дванаццатая гадавіна з дня абвяшчэння Кітайскай Народнай Рэспублікі. На многіх гарадскіх і сельскіх кінаўстаноўках Беларусі ў гэтыя дні арганізаван паказ кітайскіх кінафільмаў. «Смелы, як тыгр», «Аповесць аб вёсцы Любао», «Песня пальмавага гаю», «Крама пана Ліня», «Чырвоны ўраган», «Сёстры на лёдзе», «Хлопцы з нашай вёскі», «Тайная разведка», «Вялікі паход», «Марская душа», «Безымянны вострaў», «Подзвіг рулявога» і інш.

У гэтыя дні на экранах рэспублікі таксама дэманструюцца кітайскія хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінакарціны.

У многіх кінатэатрах арганізаваны фотавыстаўкі, якія адлюстроўваюць поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы.

Р. ЗАЙЦАЎ.

НА ГАСТРОЛЯХ Ў МІНСКУ

У Мінску адбыліся канцэрты лаўрэата міжнародных конкурсаў піяністаў Уладзіміра Ашкеназі і групы артыстаў эстрады Украінскай ССР з удзелам лаўрэата ўкраінскага конкурсу эстрады Алексея Срыбнага.

На здымку ўверсе вы бачыце выступленне вядомага савецкага піяніста, які разам з сімфанічным аркестрам выконвае Другі фартэпіянны канцэрт С. Пракоф'ева. На здымку ўнізе паказаны А. Срыбны, які чытае гумарыстычнае апавяданне.

Фота Ул. Крука.

Пісаў Хімка, пісаў Яўтух...

Паэма «Тарас на Парнасе» — самы яркі і выдатнейшы твор беларускай літаратуры XIX стагоддзя, з'ява выключнай важнасці, якая пераканаўча сведчыла і сведчыць пра вялікія магчымасці і багацце беларускага мастацкага слова. Усімі колерамі вясёлкі зазе гэты самародак беларускай паэзіі, цесна звязаны з жыватворнымі крыніцамі айчыннага фальклору, самародак, які, без перабольшання, знаходзіцца на ўзроўні лепшых дасягненняў сусветнай літаратуры.

Чаруе і здзіўляе, радуе і хвалюе нас у паэме «Тарас на Парнасе» ўсё: і рэалістычныя малюнкі сялянскага побыту, і арыгінальны водгук на падзеі літаратурна-грамадскага жыцця, і дасціпны гумар, і з'едлівая сатыра, і сапраўднае наватарства, і дынамізм дзеяння, і дасканалая паэтыка, і незвычайна каларытная народная мова.

Не адно пакаленне даследчыкаў праяўляла пільную ўвагу і цікавасць да гэтага класічнага твора, спрабуючы разгадаць гісторыю і час яго напісання, а таксама высветліць пытанне аўтарства паэмы. Некаторыя прыпісвалі «Тараса на Парнасе» В. Дуніну-Марцінкевічу, іншыя лічылі, што паэму напісалі студэнты Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. На адным толькі пагаджаліся даследчыкі: усе яны лічылі, што невядомы аўтар — надзвычай таленавіты паэт, чалавек адукаваны, выхаваны на рускай культуры і рускай паэтычнай традыцыі, і ў той жа час асоба, якая добра ведала жыццё і побыт працоўнага беларускага селяніна.

Розныя меркаванні выказваліся адносна часу напісання паэмы. Большасць даследчыкаў лічыла, што ананімны твор напісаны ў канцы 30-х ці пачатку 40-х гадоў мінулага стагоддзя. Праўда, частка літаратуразнаўцаў, зыходзячы з таго факта, што паэма «Тарас на Парнасе» ўпершыню трапіла ў друк толькі ў 1889 г., схілялася да думкі, што напісана яна значна пазней, толькі ў 70—80 гады.

У сувязі з тым, што і цяпер ёсць прыхільнікі другой версіі, мне хочацца, не ўдаючыся ў падрабязнасці, выказаць свае погляды на гэтае пытанне. Сапраўды, паэма з'явілася ў друку позна, але нельга не звярнуць увагі на той факт, што яна к гэтаму часу была ўжо вельмі і вельмі папулярнай у народзе на Віцебшчыне, Магілёўшчыне, Міншчыне і Смаленшчыне, дзе распаўсюджваліся рукапісныя спісы з рознымі варыянтамі і дыялектнымі напластаваннямі. Паўстае пытанне, калі паэма напісана толькі ў 70—80 гады ці нават, як гэта сцвярджае Р. Зямкевіч («Савецкая Беларусь», 1928, № 78), прывезена з Сібіры толькі ў 1885 г., дык ці мог так хутка рукапісны твор набыць шырокую папулярнасць і распаўсюджанне? Мне здаецца, на гэта быў патрэбен даволі значны адрэзак часу.

Дарэчы тут прывесці яшчэ адно цікавае сведчанне — артыкул невядомага аўтара «Спроба пяра», аб якім упамінае літаратуразнаўца І. Бас («Беларуская літаратура. Даследаванні і публікацыі», III). У артыкуле «Спроба пяра», які ў 1896 г. быў прысланы ў рэдакцыю «Витебских губернских ведомостей» адзначаецца пра паэму «Тарас на Парнасе» наступнае: «Ужо гадоў больш як **сорак** (у арыгінале спачатку было — **пяцьдзесят.— С. А.**) беларуская байка гэта стала ўсім вядома ў трох губорнях: Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай... «Тараса» найдзеш на ўсякай хаце. Пісьменныя шчыра пішуць яго сабе на паперу, цёмныя (непісьменныя.—**С. А.**) яшчэ шчырэй вучацца яго напамяць». Апрача сведчання аб выключнай папулярнасці паэмы, цікава тут сцвярджанне аб тым, што ананімны твор вядомы ў народзе яшчэ з 40—50 гадоў XIX стагоддзя.

На маю думку, ускосна пацвярджае гэта і тая акалічнасць, што адклікаючыся на літаратурна-грамадскае жыццё свайго часу, невядомы аўтар гаворыць пра рускіх пісьменнікаў 30—40 гадоў, сваіх суайчыннікаў, менавіта—Пушкіна, Лермантава, Жукоўскага, Гогаля. Калі б паэма «Тарас на Парнасе» была напісана пазней, у 70—80 гг., дык ці мог бы паэт гаварыць пра літаратурную барацьбу 30—40 гадоў і ні адным словам не ўспомніць Талстога, Некрасава, Тургенева, Салтыкова Шчадрына, якія былі ўладарамі дум народа і голасам сумлення рускай літаратуры другой паловы XIX ст.?

А цяпер пяройдзем да асноўнай тэмы. У лістападзе 1958 года Вучэбна-педагагічнае выдавецтва БССР атрымала ліст з далёкай Чувашыі, з г. Алатыр. Урач-беларус А. З. Шаўцоў — колішні жыхар Клімавіцкага раёна, паведамляў сямейнае паданне пра свайго прадзеда, які нібыта напісаў паэму «Тарас на Парнасе».

Коратка сутнасць гэтай цікавай, але спрэчнай гісторыі зводзіцца да наступнага. Афіцэр рускай арміі (сапраўднае прозвішча яго невядома), які служыў доўгі час у Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях, за ўдзел у паўстанні дзекабрыстаў быў пасаджаны ў Александраўскі цэнтрал. Нейкім чынам яму ўдалося ўцячы з крэпасці і дабрацца да сваіх сяброў — паноў Шабанскага, Ваяводскага і Гальнскага, якія мелі маёнткі ў Клімавіцкім павеце. Беглы дзекабрыст, якога царскія ўлады лічылі мёртвым, тайком жыў у вёсках Царкавішча, Дамамерычы, Гусарка, пакуль пры дапамозе сяброў не дастаў дакументы на імя селяніна Яўхіма Крупенькі. Пасля пайшоў ён пад старасць у прымы да Хімкі, бацькі якой Панас жыў у засценку Пуцявішча, недалёка ад лазні. Вось гэты Яўхім Крупенька ў Пуцявішчы напісаў паэму «Тарас на Парнасе». Памёр ён каля 1841—1842 года, пахаваны ў Пуцявішчы (цяпер в. Свірэль, 3 км. ад Клімавіч).

Далей А. З. Шаўцоў паведамляе, што яшчэ ў 1907—1913 гг. яго бацьку і іншых сваякоў не раз выклікалі да пристава ў Клімавічы і распытвалі пра лёс Яўхіма Крупенькі. Паведамляе таксама тая, Шаўцоў, што ён некалі меў кнігу «Тарас на Парнасе» смаленскага выдання, якую ў 1929 г. перадаў брату М. З. Шаўцову.

На першы погляд усё ў гэтай цікавай гісторыі пра невядомага і загадкавага Яўхіма Крупеньку здаецца малаверагодным. Прайшло шмат часу, калі жыў на свеце беглы дзекабрыст, якога лёс закінуў у глухі закутак Беларусі, і ў драматычнай легендзе, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне, многае зараз яясна. Цяпер цяжка ўстанавіць, што ў гэтых скупых і цьмяных звестках пра Яўхіма Крупеньку з'яўляецца рэальнасцю, а што паданнем. Яшчэ цяжэй вызначыць, ці меў ён якое-небудзь дачыненне да паэмы «Тарас на Парнасе»...

Увагу даследчыка можа прыцягнуць толькі той факт, што Я. Крупенька жыў у засценку **Пуцявішча**, які пасля рэформы 1861 г. перарос у вёску Свірэль. Цесць яго **Панас** быў **палясоўшчыкам**, хата яго стаяла **непадалёку ад лазні**. Усё тут, як бачна, пераклікаецца з пачаткам паэмы «Тарас на Парнасе»:

Ці знаў хто, братцы, з вас Тараса,
У палясоўшчыках што быў?
На Пуцявішчы, у Панаса,
Ён там ля лазні блізка жыў.

У гісторыі пра Я. Крупеньку ёсць адзін момант, які прыцягвае ўвагу. Я думаю, што аўтар паэмы «Тарас на Парнасе» ведаў вартасць свайго твора, але ў яго, відаць, былі нейкія вельмі сур'ёзныя прычыны застацца інкогніта, утаіць сваё прозвішча. Мне здаецца, перыпетыі жыцця дзекабрыста, які ўцёк ад рэпрэсій царскіх улад, дастаткова абгрунтоўваюць гэтую прычыну.

Аднак вельмі і вельмі мала было ў гэтай гісторыі пераканаўчых фактаў, якія калі не прама, дык хоць бы ўскосна сведчылі б пра тое, што аўтарам паэмы «Тарас на Парнасе» з'яўляецца Яўхім Крупенька. Аўтар гэтага артыкула таксама скептычна ставіўся да гэтай легендарнай гісторыі, пакуль яму не давялося натрапіць у Цэнтральным гістарычным архіве Літоўскай ССР на невядомы рукапісны спіс выдатнай паэмы (Фонд «Віленскага таварыства сяброў навукі», № 1135, вопіс 10, справа № 219).

Тэкст гэтага рукапіснага спіса падаецца латынкай, да некаторых беларускіх дыялектных слоў ёсць тлумачэнні на польскай мове (palasoŷšchyk lesnik, рахманы — spokojny, łagodny, заўжды — zawsze і г. д.). Трэба меркаваць, што запіс зроблены ў канцы XIX стагоддзя (папера пажоўкла, чорнае чарніла выцвіла і набыло карычневае адценне). Паэма названа не «Тарас на Парнасе», а проста «Тарас». Па характару лексікі і розначытанняў тэкст гэты блізкі да тэксту, які друкаваўся ў «Смоленском вестнике» (1890 г., № 37), а таксама да рукапісных спісаў, якія захоўваюцца ў паперах вядомага фальклярыста П. Шэйна і ў Цэнтральнай бібліятэцы АН Літоўскай ССР. Істотнай асаблівасцю тэксту з'яўляецца і тое, што, пачынаючы з пятага раздзела (у іншых спісках толькі з дзевятага), гаворка пра палясоўшчыка Тараса ідзе не ў першай асобе, а ў трэцяй:

Падумаў наш Тарас нямнога:
Што за шатан Парнас такі?
І лупіць проста той дарогай,
Узяўшы ў рукі добры кій.
Ёсць у рукапісу і страфа, якая прапушчана чамусьці ў адзінаццатым раздзеле тэксту, які ў нейкай меры стаў кананічным і змяшчаецца ў школьных хрэстаматыях:
Яна ў хазяйкі ўзята ў неба,
Штобы багам есць варыць,
(Нябось на цяжкім жырнеці хлебе,
Ці шутка стольких накарміць!)

Але гэты спіс паэмы цікавы і каштоўны галоўным чынам **своёй канцоўкай**, якая адсутнічае ва ўсіх вядомых друкаваных і рукапісных тэкстах выдатнага твора:
Пісаў Хімка, пісаў Яўтух,
Пісалі б болей, але агонь патух...

Канцоўка прыпісана алоўкам і, відавочна, не належыць той асобе, якая рабіла запіс усяго тэксту паэмы (почырк у прыпісцы іншы). Гэта давала падставу рабіць вывад, што канцоўка дапісана значна пазней. Усё ж прыпіска мае значную цікавасць, бо гэта адзінае пакуль што ядомае месца паэмы, дзе зашыфраваны загадкавы адказ на пытанне, хто з'яўляецца аўтарам «Тараса на Парнасе».

Я разумеў, што навуковая вартасць гэтай прыпіскі значна ўзрасце, калі мне ўдасца даказаць, што яна зроблена не рукою якога-небудзь даследчыка, які ў адчаі знайсці сапраўднага аўтара паэмы, сам дапісаў канцоўку... Трэба было даказаць, што гэтыя два радкі бытуюць у народзе даўно. У пошуках гэтых загадкавых радкоў пра Хімку і Яўтуха пераглядзеў я многія друкаваныя і рукапісныя зборнікі паэтычных фальклорных твораў. Усё дарэмна! І вось зусім нядаўна ў першай частцы «Смаленскага этнаграфічнага зборніка» (Пецярбург, 1891 г., стар. 70) я, нарэшце, сярод празаічнага тэксту натрапіў на доўгачаканае месца. Вядомы этнограф і фалькларыст У. Дабравольскі прыводзіць дасловны запіс размовы з селянінам Лукіянам Андрэевым з в. Велікава Бельскага павета. Селянін у сваёй размове, перасыпанай прымаўкамі, між іншым гаворыць:

Пісаў Мінка,
Пісаў і Яўтух;
Пісалі б болей
Ды агонь патух...

Не мае істотнага значэння тое, што замест Хімкі ў «Смоленском этнографичном сборнике» стаў Мінка (селянін-расказчык мог проста пераблытаць ці змяніць імёны!). Тут важны сам факт, што радкі, якія з'яўляюцца канцоўкай у віленскім спісе, бытавалі ў народзе да 1890 года.

У святле легендарнай гісторыі пра Яўхіма Крупеньку радкі пра Хімку і Яўтуха набываюць асаблівае значэнне. Цяжка рабіць зараз якія-небудзь катэгарычныя вывады, але можна дапусціць меркаванне, што паміж гэтымі радкамі і гісторыяй пра беглага дзекабрыста ёсць пэўная сувязь. Сапраўды, Хімка—гэта, магчыма, сам Яўхім Крупенька (на Віцебшчыне і Магілёўшчыне Яўхіма ласкальна называюць Хімка). Напомнім, што, паводле сведчання А. З. Шаўцова, жонка Я. Крупенькі насіла таксама імя Хімкі...

Хто ведае, можа, у гэтай цьмянай і вельмі глухой пакуль што гісторыі ёсць рацыянальнае зерне, якое дапаможа разгадаць загадку, над якой беспаспяхова білася літаратуразнаўцы. Трэба весці далейшыя пошукі і ўдакладненні ў гэтым кірунку. Цікава было б устанавіць, ці сапраўды вёска Свіраль Клімавіцкага раёна калісьці называлася Пуцявішча і ці жыў у ёй ляснік Панас Лявонаў. Добра было б таксама даведацца пра лёс настаўніка Хоцімскай сярэдняй школы Шаўцова Максіма Захаравіча, які ў перадваенны час сабраў шмат матэрыялаў пра Яўхіма Крупеньку. Паўныя звесткі могуць даць і аохіўныя пошукі. Калі сапраўды Клімавіцкага прыстава цікавіла асоба Я. Крупенькі, дык нейкі след мог застацца ў архіўных матэрыялах. Нарэшце, у лістах праўнукаў Я. Крупенькі, якія А. З. Шаўцоў прыслаў у Інстытут літаратуры імя Я. Купалы, ёсць глухое ўпамінанне пра нейкія паперы, знойдзеныя пры зносе дома, дзе жыў прымак Хімкі — беглы дзекабрыст. Да каго трапілі гэтыя паперы і што яны сабой уяўлялі?

Я ведаю, многія з недавер'ем і скептыцызмам успрымуць новую версію пра аўтарства паэмы «Тарас на Парнасе». Многае, вядома, і для мяне яшчэ няясна, але я глыбока пераканаў, што ў гэтых глухіх і цьмяных звестках, якія пераклікаюцца з заключнымі радкамі віленскага спіса паэмы, ёсць нешта вартае ўвагі. Зваблівая перспектыва разгадаць загадку і раскрыць імя аўтара выдатнага твора, імя, якому належыць па праву месца побач з імёнамі Янкі Купалы і Якуба Коласа, апраўдвае далейшыя пошукі і з'яўленне гэтага артыкула.

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Паважаны таварыш рэдактар! Дазвольце праз Вашу газету выказаць сардэчнае дзякуй усім арганізацыям і таварышам, якія павіншавалі мяне з 50-годдзем і ўзнагародай Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Анатоль АСТРЭЙКА.

З кінакамерай па рэспубліцы

Аб дастойнай сустрэчы, якую рыхтуюць на Мінскім падшыпнікавым заводзе XXII з'езду роднай партыі, расказвае першы сюжэт кіначасопіса «Савецкая Беларусь» № 27 вытворчасці Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў.

У наступных кінакадрах гледачы пазнаёмяцца з высокімі паказчыкамі, якія прадэманстравалі працаўнікі калгаснай вёскі Міншчыны на абласной выстаўцы кармавых, тэхнічных і гароднінных культур.

Трыццацігадоваму юбілею віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ» прысвечан кінасюжэт «Слаўнае трыццацігоддзе».

З цікавасцю будзе прагледжан кінарэпартаж, зняты аператарам Л. Аксёненкам на новым торфабрыкетным заводзе «Усвіж-Бук», што пабудаваны нядаўна ў багатых торфам мясцінах Віцебшчыны.

Аб судзе над фашысцкім наймітам — былым начальнікам Обальскай паліцыі Экертам расказвае кінасюжэт «Народ абвінавачвае».

У аматараў спорту асаблівую цікавасць выклікаюць кінакадры аб усесаюзных спаборніцтвах таварыства «Дынамо» ў Мінску, у якіх прымалі ўдзел мацнейшыя майстры эспадрона, шпагі і рапіры нашай краіны.

Заключны сюжэт кіначасопіса прысвечан Азершчынскаму сельскаму хору, якому споўнілася нядаўна 25 год.

ЦЁПЛАЯ ВОСЕНЬ Фотаэцюд І. ШЫШКО.

ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫКАЎ!

З першага кастрычніка г.г.

АДКРЫТА ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ ПАДПІСКА

НА ЎСЕ ЦЭНТРАЛЬНЫЯ, РЭСПУБЛІКАНСКІЯ, АБЛАСНЫЯ, ГАРАДСКІЯ, РАЁННЫЯ І ЗАРУБЕЖНЫЯ ГАЗЕТЫ І ЧАСОПІСЫ НА 1962 ГОД

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ўсімі канторамі і аддзяленнямі сувязі, «Саюздрукам», а таксама грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку па месцы работы ці вучобы.

З каталогам газет і часопісаў, на якія прымаецца падпіска, Вы можаце азнаёміцца ў грамадскага распаўсюджвальніка друку па месцы работы, у канторах і аддзяленнях сувязі, у «Саюздруку».

РЭКАМЕНДУЕМ ВЫПІСВАЦЬ ГАЗЕТЫ І ЧАСОПІСЫ НА БОЛЬШ ПРАЦЯГЛЫ ТЭРМІН. ГЭТА ЗАХАВАЕ ВАМ ПОЎНЫ КАМПЛЕКТ ВЫДАННЯ І ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ БЕСПЕРАБОЙНУЮ ДАСТАЎКУ.

«САЮЗДРУК»
Міністэрства сувязі БССР.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: Зэір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 00388

Друкарня імя Сталіна